Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

10 ВЕРАСНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 173 (28031) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Дойлідства — мастацтва сучаснае

СТАР. 4-5

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Як Міцкевіч пасябраваў з Сысам

Увага, новы конкурс "ЧЗ"!

ЦЫТАТА ДНЯ

Павел КАЛАУР, старшыня Праўлення Нацыянальнага банка:

«Інфляцыя ў Беларусі сёлета не перавысіць прагнозу, зробленага ў пачатку года, у 18% плюс-мінус два працэнтныя пункты. Увогуле на рынках сёння назіраецца стабільная сітуацыя. Палітыка Нацбанка праводзіцца на гнуткай аснове. Ва ўмовах высокай нявызначанасці трэба своечасова ўмець рэагаваць на змены кан'юнктуры і асабліва на выклікі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.09.2015 г.

Долар ЗША	17807,00	▼
Еўра	19898,00	▼
Рас. руб.	263,13	▲
Укр. грыўня	810,79	▲

ISSN 1990 - 763X

Мядовае рамяство

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхарка вёскі Цяплень Уздзенскага раёна Аксана МАТУШКІНА заўсёды прымае ўдзел у мядовых кірмашах. Прафесійны заатэхнік па пчалярстве, Аксана Мікалаеўна ўжо сем сезонаў на сваім пчальніку атрымлівае добрыя меды. А Дзмітрый БАРЫСАВЕЦ з вёскі Грозава Слуцкага раёна вядомы не толькі сваім мёдам, але і пчоламі: ён знатны на Міншчыне заводчык пчаліных сем'яў.

НАКАРМІЦЬ ПЛАНЕТУ

Беларусь уносіць важкі ўклад у забеспячэнне сусветнай харчовай бяспекі

Менавіта аб гэтым гаварыў учора прэм'ер-міністр краіны Андрэй КАБЯКОЎ на адкрыцці Нацыянальнага дня Беларусі на «ЭКСПА-2015» у італьянскім Мілане, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Андрэй Кабякоў сказаў, што цяперашняя выстаўка «ЭКСПА» для Беларусі набывае асаблівую актуальнасць, паколькі яе тэма «Накарміць планету. Энергія для жыцця». «Беларусь — краіна са шматвяковымі аграрнымі традыцыямі. Мы на штодзённай аснове ўносім свой уклад у забеспячэнне сусветнай харчовай бяспекі», — адзначыў прэм'ер-міністр. Кіраўнік беларускага ўрада нагадаў, што Беларусь уваходзіць у пяцёрку найбуйнейшых сусветных экспарцёраў малочнай прадукцыі і ў тройку экспарцёраў масла. У Беларусі вырабляецца кожны дзясяты трактар у свеце і кожны трэці кар'ерны самазвал.

«Беларусь поўнасцю разумее тую важную ролю, якую адыгрывае «ЭКСПА» ў вырашэнні адной з глабальных праграм штодзённасці — няхваткі прадуктаў харчавання. Хачу выказаць удзячнасць за такую высакародную місію і запэўніць, што мы падзяляем гэтыя памкненні і ў нашай асобе вы знойдзеце надзейную падтрымку», — заявіў прэм'ер-міністр.

Адкрыла праграму Нацыянальнага дня Беларусі святкаванне «Беларускіх дажынак у Італіі». Тэрміны правядзення дня Беларусі на выстаўцы ў верасні супадаюць з завяршэннем уборачнай кампаніі і святкаваннем «Дажынак». Улічваючы дэвіз выстаўкі «Накарміць планету. Энергія для жыцця» і пажаданні яе арганізатараў аб максімальным прадстаўленні ў культурнай праграме народнай музыкі, свят і абрадаў, звязаных з земляробчым цыклам, цырымоніяй адкрыцця Нацыянальнага дня Беларусі стала святочная праграма «Беларускія дажынкі ў Італіі».

СТАР. 3

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА
5 разоў на тыдзень!

Падпісацца на газету на IV квартал можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпісацца на «Звязду» можна заўсёды!

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

Давер Прэзідэнту

Як сведчаць вынікі сацыялагічных даследаванняў, праведзеных у жніўні 2015 года Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам, давер Прэзідэнту краіны Аляксандру Лукашэнку выказвае 76,6 працэнта дарослага насельніцтва краіны. Аб гэтым паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

На думку пераважнай большасці грамадзян (74,1 працэнта), дзейнасць Прэзідэнта адпавядае інтарэсам простых людзей. Згодны са сцвярджэннем аб тым, што пад кіраўніцтвам Аляксандра Лукашэнкі Беларусь у цэлым развіваецца ў правільным напрамку, 77,1 працэнта апытаных.

ВЫРАШЫЦЬ ПРАБЛЕМУ АДНЫМ ЗВАНКОМ

У гэтую суботу ў краіне зноў адбудуцца прамыя тэлефонныя лініі

У Мінску і абласцях на сувязь выйдуць чыноўнікі ўсіх рангаў. Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі працуюць не першы месяц, таму шмат сур'ёзных праблем ужо вырашана. Часцяком просьбы, з якімі звяртаюцца грамадзяне, знаходзяць рашэнне да канца дня. У топе праблемных сфер па-ранейшаму — будаўніцтва, ЖКГ і транспартныя зносіны.

Нагадаем, штотыднёвае правядзенне аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам прамых тэлефонных ліній арганізавана з мэтамі павышэння эфектыўнасці працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, а таксама для аператыўнага рашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей. Стартавалі прамыя тэлефонныя лініі 17 студзеня.

У гэтую суботу, 12 верасня, з 9.00 да 12.00 на сувязь з насельніцтвам выйдуць:

Брэсцкі аблвыканкам
першы намеснік старшыні ТОКАР Мікалай Васільевіч (80162213121);

Віцебскі аблвыканкам
кіраўнік спраў МАЦЮШКА Аляксей Уладзіміравіч (8021 2204260);

Гомельскі аблвыканкам
намеснік старшыні ПАЧЫНОК Алег Міхайлавіч (80232751237);

Гродзенскі аблвыканкам
намеснік старшыні ШУЛЕЙКА Юрый Вітольдавіч (80152735644);

Мінскі аблвыканкам
старшыня абласнога Савета дэпутатаў ЛІПНІЦКІ Іван Эдуардавіч, (80175004160);

Магілёўскі аблвыканкам
намеснік старшыні МАЛАШКА Валерый Анатольевіч (80222501869);

Мінскі гарвыканкам
першы намеснік старшыні КУХАРАЎ Уладзімір Яўгенавіч (80172224444).

У МІНСКУ ВЫЗНАЧЫЛІ МЕСЦЫ ДЛЯ ПЕРАДВЫБАРНАЙ АГІТАЦЫІ

Як паведамілі БЕЛТА ў Мінгарвыканкаме, масавыя мерапрыемствы для ажыццяўлення перадвыбарнай агітацыі вызначана праводзіць у любых прыдатных для гэтых мэт месцах на тэрыторыі Мінска, за выключэннем аб'ектаў метрапалітэна, чыгуначнага і паветранага транспарту, падземных пешаходных пераходаў, мастоў і пуцеправодаў, праезнай часткі аўтамабільных дарог; Кастрычніцкай плошчы, плошчы Незалежнасці, плошчы Перамогі, плошчы Дзяржаўнага сцяга, Прывакзальнай плошчы, плошчы Якуба Коласа; размешчаных на адлегласці менш як 200 м ад будынкаў рэзідэнцыі Прэзідэнта, Нацыянальнага сходу, Савета Міністраў; размешчаных на адлегласці менш як 50 м ад будынкаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых прадстаўнічых, выканаўчых і распарадчых органаў, дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх установ, судоў, органаў пракуратуры, тэрыторыяльных арганізацый, якія забяспечваюць абараназдольнасць і бяспеку дзяржавы, дзіцячых дашкольных устаноў.

■ Выбары-2015

РАЗМОВА ЗАЦІКАЎЛЕНЫХ

Кіраўніцтва Цэнтральнай выбарчай камісіі сустрэлася з папярэдняй місіяй ПАСЕ

Учора адбылася сустрэча папярэдняй місіі Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы па назіранні за прэзідэнцкімі выбарамі Беларусі са старшынёй Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзіяй Ярмошынай і сакратаром ЦВК Мікалаем Лазавіком. Апошні, даючы каментарый журналістам, назваў гэтую сустрэчу размовай зацікаўленых людзей.

«У мяне асабіста склалася меркаванне, што гэтая сустрэча насіла не нейкі дзяжурны, пратакольны характар, а зацікаўлена-дзелавы, — прызнаўся сакратар Цэнтрвыбаркама. — Нашы госці цікавіліся структурай Цэнтральнай выбарчай камісіі, яе статусам. Яны задавалі пытанні наконт паўнамоцтваў ЦВК».

Назіральнікі таксама цікавіліся, якімі арганізацыйнымі і юрыдычнымі магчымасцямі валодае камісія для забеспячэння законнасці выбарчага працэсу. «Асобна ставілася пытанне аб забеспячэнні роўных правоў усіх удзельнікаў выбарчага працэсу», — дадаў Мікалай Лазавік.

Кіраўнік ЦВК пазнаёміла дэлегацыю з тым, як праходзіць цяперашняя кампанія, з асноўнымі палажэннямі выбарчага заканадаўства.

«У канкрэтызуючых пытаннях госці ўдакладнілі працэдуру вылучэння кандыдатаў, працэдуру збору і праверкі подпісаў», — сказаў сакратар Цэнтрвыбаркама. Акрамя таго, прадстаўнікі ПАСЕ цікавіліся тым, наколькі поўную інфармацыю аб выбарах атрымлівае насельніцтва, з якіх крыніц, якія спосабы данясення інфармацыі ўвогуле выкарыстоўваюцца ў краіне. Было зададзена пытанне і наконт новаўвядзенняў цяперашняй кампаніі. Гэта тычылася момантаў не толькі заканадаўчага, але і чыста тэхнічнага характару, напрыклад, прымянення празрыстых урнаў. Гаворка ішла пра асаблівасці галасавання за межамі Беларусі.

Назіральнікі дэталёва вывучылі і саму працэдуру галасавання. Размова ў тым ліку закранула спісы выбаршчыкаў, механізмы пазбягання двайнога галасавання.

Надзея АЛЕКСАНДРОВІЧ.

СТАРШЫНЯ «БЕЛАЙ РУСІ» СУСТРЭЎСЯ З КІРАЎНІКОМ ДОЎГАТЭРМІНОВАЙ МІСІІ БДІПЧ АБСЕ

У цэнтральным офісе рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» учора адбылася сустрэча старшыні гэтай арганізацыі Аляксандра РАДЗЬКОВА з кіраўніком доўгатэрміновай місіі БДІПЧ АБСЕ Жакам ФОРАМ.

«На сустрэчы былі разгледжаны пытанні ўдзелу аб'яднання ў выбарчай кампаніі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2015 года, палітычная сітуацыя ў свеце і краіне, прынцыпы і метадалогія працы БДІПЧ АБСЕ ў Рэспубліцы Беларусь, — паведамляе прэс-служба грамадскага аб'яднання. — У прыватнасці, была абмеркавана роля «Белай Русі» на этапе збору подпісаў за вылучэнне кандыдата ў Прэзідэнты, праца назіральнікаў і членаў тэрытарыяльных камісій ад аб'яднання, а таксама планы па ўдзеле членаў «Белай Русі» ў агітацыйнай працы з выбаршчыкамі».

Місія і прафсаюзы

Учора ў штаб-кватэры Федэрацыі прафесійных саюзаў Беларусі адбылася сустрэча старшыні Міхаіла ОРДЫ з папярэдняй місіяй ПАСЕ па назіранні за прэзідэнцкімі выбарамі.

Прафсаюзны лідар расказаў дэпутатам Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы, як у Беларусі працуе прынцып трохпартызму — трохбаковых кансультацый з мэтай выпрацоўкі кампраміснага трохбаковага пагаднення прафсаюзаў, прадпрымальнікаў і ўрада.

— Мы рэгулярна збіраемся з урадам і наймальнікамі, каб абмеркаваць праблемы, якія існуюць у эканоміцы і сацыяльнай сферы, вельмі часта спрачаемся, нярэдка бяром тайм-аўт, але самае галоўнае — заўсёды імкнёмся знайсці кансэнсус і кампрамісы, каб гэтыя праблемы вырашыць, — сказаў ён. — У нас існуе Генеральнае пагадненне паміж урадам Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскімі аб'яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзамі. Гэта своеасаблівыя правілы гульні ў эканоміцы, фарміраванні заробкаў, сацыяльнай абароне, на рынку працы і ва ўзаемадзеянні ўсіх зацікаўленых бакоў, якія мы прапісваем на кожныя два гады.

Міхаіл Орда паведаміў, што сёлета Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі старшынствуе ў Нацыянальным савеце па працоўных і сацыяльных пытаннях, адна з апошніх дамоўленасцей якога — абавязковая правая экспертыза ў прафсаюзным прававым цэнтры ўрадавых пастаноў, што датычацца працоўных правоў грамадзян.

— Магчымасць папярэдне абмеркаваць тую або іншую пастанову, якая закранае ўзровень заробкаў або сацыяльныя пытанні, і знайсці рашэнне, што задаволіць усіх — і наймальнікаў, і чалавека працы — садзейнічае захаванню стабільнасці ў грамадстве, — лічыць старшыня ФПБ. — Спрачацца трэба не на барыкадах, а за сталом перагавораў. Прафсаюз — гэта тая арганізацыя, якая вельмі дакладна адчувае настроі ў грамадстве, бо мы прадстаўлены ва ўсіх сектарах эканомікі нашай дзяржавы.

Міхаіл Орда таксама патлумачыў міжнародным назіральнікам за выбарамі, чаму ён асабіста ўзначаліў ініцыятыўную групу дзейнага кіраўніка дзяржавы па вылучэнні яго кандыдатам.

— Мы не можам заставацца ўбаку ад палітычных працэсаў, якія адбываюцца ў дзяржаве, у тым ліку выбараў, бо ад іх вынікаў залежыць далейшы лёс краіны, — сказаў ён. — Палітыка, якую праводзіць дзейны Прэзідэнт, сугучная рабоце, якую праводзяць прафсаюзы. Гэта захаванне працоўных месцаў, працоўных калектываў, своечасовая выплата заробкаў, распаўсюджванне сацыяльных гарантый для ўсіх, хто мае ў гэтым патрэбу, папярэджанне рэзкага расслаення грамадства па даходах. Таму на нядаўнім VII з'ездзе Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі мы прынялі рашэнне падтрымаць дзейнага Прэзідэнта на выбарах, а старшыня федэрацыі ў маёй асобе ўзначаліў ініцыятыўную групу па яго вылучэнні кандыдатам.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА. *medvedeva@zviazda.by*

■ Еўразійская прастора

КРЫЗІС ЯК СТЫМУЛ

Пра эфект ад прынятых Еўразійскім міжурадавым саветам у Гродне дакументаў можна будзе казаць пазней, калі, дзякуючы агульным намаганням, эканомікі пяці краін пакажуць відавочны рост, калі саюзная прадукцыя не будзе баяцца цэнавай і якаснай канкурэнцыі і калі жыць на гэтай тэрыторыі стане не менш прывабна, чым па-за яе межамі. Праўда, тады можа паўстаць праблема нелегальных мігрантаў у ЕАЭС, але вырашаць праблемы будзем па меры іх паступлення.

Клопат дня сённяшняга — дамовіцца пяці названым краінам пра тое, што найлепш выгадна разам, як абараніць свае фінансавыя і таварныя рынкі і якім чынам выбудоўваць адносіны з астатнім светам. Менавіта ў гэтых напрамках 8 верасня ў Гродне кіраўнікі ўрадаў краін — удзельніц інтэграцыйнага аб'яднання зрабілі практычныя крокі наперад.

Па-першае, яны ўхвалілі праект Асноўных кірункаў прамысловага супрацоўніцтва ў рамках ЕАЭС. Сайт Еўразійскай эканамічнай камісіі паведамляе, што дакумент разлічаны на найбліжэйшыя 5 гадоў, ён сфарміраваны, зыходзячы з мэтазгоднасці паглыблення прамысловай кааперацыі, а таксама з улікам бягучых тэндэнцый развіцця эканомік краін ЕАЭС і сусветнай эканомікі.

Дакумент вызначае мэтай прамысловага супрацоўніцтва «пяцёркі» рэалізацыю патэнцыялу эфектыўнага і ўзаемавыгаднага ўзаемадзеяння дзяржаў-членаў. Такое ўзаемадзеянне неабходна для паскарэння прамысловага развіцця, павышэння канкурэнтаздольнасці і інавацыйнай актыўнасці ў саюзе.

Найбольш перспектыўнымі сегментамі агульнага рынку названы транспарт, электраабсталяванне, оптыка і электроніка, хімічная прадукцыя, метал і металаканструкцыі. У адпаведнасці з Асноўнымі кірункамі прамысловага супрацоўніцтва краіны-члены сумесна вызначаць прыярытэты ў сваіх эканоміках.

Другі важны дакумент, падпісаны Міжурадавым саветам, — Асноўныя кірункі міжнароднай дзейнасці ЕАЭС, якія абазначылі прыярытэты ў супрацоўніцтве саюза з ключавымі партнёрамі.

«Тут у Еўразійскага эканамічнага саюза — самы шырокі спектр інтарэсаў, бо гэта адкрытае аб'яднанне, якое мае намер развіваць адносіны з усімі сусветнымі эканамічнымі цэнтрамі ад Лацінскай Амерыкі да Паўднёва-Усходняй Азіі», — каментуе дакумент прэс-служба Еўразійскай эканамічнай камісіі.

Паказальна, што кіраўнікі ўрадаў ухвалілі праект памятнай запіскі аб перспектывах супрацоўніцтва ЕАЭС з Еўрапейскім саюзам. Гэты дакумент павінен паслужыць практычнаму пачатку дыялогу двух інтэграцыйных аб'яднанняў у Еўра-Атлантыцы і Еўразіі і фарміраванню адзінай эканамічнай і гуманітарнай прасторы ад Атлантыкі да Ціхага акіяна.

Такім чынам, у Гродне два дні таму былі зроблены вельмі важныя захады — па рэальным аб'яднанні намаганняў унутры Еўразійскага эканамічнага саюза, а таксама — у кантынентальным маштабе. Можна сказаць, што пасля слоў аб інтэграцыі інтэграцый, якія былі сказаны раней, з'явіліся дакументы. Наступны этап — справы. І справы гэтыя будуць залежаць ужо не толькі ад волі кіраўнікоў урадаў і краін, але і ад жадання і волі народаў гэтых краін: прадпрымальнікаў, вучоных, рабочых. На жаль, мы ўжо занадта добра адчулі, наколькі можам размяжоўвацца, супрацьпастаўляць, абвінавачваць і не давяраць. Магчыма, настаў час праверыць, наколькі мы здольны дамаўляцца, працаваць разам, падтрымліваць адзін аднаго, каб стаць больш моцнымі і самадастатковымі.

Фота БЕЛТА.

Недарэмна прэм'ер-міністр Беларусі заклікаў да цярпення і спакойнага, творчага стаўлення да праблемных пытанняў на няпростым этапе практычных дзеянняў.

Дарэчы, усе ўдзельнікі Міжурадавага савета пагадзіліся, што крызіс, як сусветны, так і ў эканоміках буйных краін планеты, можа быць не толькі выпрабаваннем, але і стымулам для больш актыўных і рашучых дзеянняў па каардынацыі намаганняў тых, хто жадае развіцця і працвітання.

Што тычыцца парадку дня ў Гродне, удзельнікі назвалі яго эфектыўным і насычаным. Наступная сустрэча Еўразійскага міжурадавага савета адбудзецца ў лістападзе ў сталіцы Арменіі Ерэване.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
medvedeva@zviazda.by

НАКАРМІЦЬ ПЛАНЕТУ

«ЭКСПА», або Сусветная выстаўка, уяўляе сабой маштабнае міжнароднае мерапрыемства, дзе кожная краіна-ўдзельніца знаёміць наведвальнікаў са сваімі эканомікай, навукай, ладам жыцця, традыцыямі, культурай, турыстычнымі магчымасцямі, дасягненнямі. Упершыню яна прайшла ў 1851 годзе, з таго часу стала рэгулярна праводзіцца ў розных краінах свету.

«ЭКСПА-2015» у Мілане працуе з 1 мая па 31 кастрычніка, удзел у ёй прымаюць 145 краін, асобныя экспазіцыі прадстаўляюць буйныя кампаніі і няўрадавыя арганізацыі. Для выставачных павільёнаў адведзена тэрыторыя плошчай больш за 1,7 млн кв.м на паўночным захадзе Мілана.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На адкрыцці Дня Беларусі ў «ЭКСПА-Цэнтры» запушчана «Кола жыцця» — сімвал вечнага руху прыроды і лёсу. На галоўнай сцэнічнай пляцоўцы «ЭКСПА» гучалі беларускія народныя песні ў выкананні артыстаў ансамбля «Харошкі». Гасцям паднеслі традыцыйны каравай з мукі новага ўраджаю.

Адбыўся шэраг бізнес-сустрэч і панэльная дыскусія «Беларусь: еўрапейскі партнёр — еўразійскі рынак» на Міланскай фондавай біржы. Гасцям выстаўкі было прапанавана адкрыць для сябе гастранамічную Беларусь і прадэгуставаць мясныя і малочныя прадукты, кандытарскія вырабы, безалкагольныя напіткі.

Завяршыўся дзень вячэрнім гала-канцэртам «Запрашае Беларусь» на адкрытай пляцоўцы «ЭКСПА-Цэнтр».

Учора ж Андрэй Кабякоў падпісаў Міланскую хартыю — важны экспертна-навуковы дакумент па пытаннях харчовай бяспекі, справядлівага сацыяльнага і геаграфічнага размеркавання харчовых рэсурсаў, здаровага ладу жыцця і сучаснай медыцыны, якая прапанавана для адабрэння ўрадам усіх краін — удзельніц выстаўкі і прызначана ў далейшым стаць асновай для міжнародных намаганняў у гэтых напрамках. Згодна з задумай арганізатараў, Міланская хартыя павінна стаць спадчынай «ЭКСПА-2015», якая можа быць своеасаблівым Кіёцкім пратаколам у галіне харчавання.

■ Фінансы

НАБЫВАЦЬ ВАЛЮТУ НАЦБАНКУ СТАНЕ ПРАСЦЕЙ

Гэта звязана з тым, што сёлета з 4 верасня Нацыянальны банк краіны атрымаў доступ да таргоў на валютным рынку Маскоўскай біржы.

Першы намеснік старшыні Праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Тарас НАДОЛЬНЫ адзначае, што валютны рынак Маскоўскай біржы з'яўляецца адным з найбольш ліквідных сегментаў інтэграванага валютнага рынку дзяржаў — членаў ЕАЭС і дае яго ўдзельнікам шырокі спектр даступных інструментаў. Атрыманне Нацбанкам краіны доступу да таргоў на валютным рынку Маскоўскай біржы, несумненна, дазволіць пашырыць магчымасці па кіраванні рэгулятарам актывамі ў замежнай валюце.

У прэс-службе Нацбанка нагадалі, што Маскоўская біржа ў лютым 2013 года адкрыла доступ да біржавога валютнага рынку банкам — рэзідэнтам краін Еўразійскага эканамічнага саюза. Банкі з Беларусі, Казахстана і Таджыкістана атрымалі магчымасць выхаду на інтэграваны біржавы рынак, маючы ліцэнзію свайго нацыянальнага рэгулятара, без неабходнасці атрымання расійскай валютнай ліцэнзіі.

Цяпер прамы доступ да валютных таргоў на Маскоўскай біржы маюць нацыянальныя банкі Беларусі і Таджыкістана, Міждзяржаўны банк, беларускія банкі — БПС-Ашчадбанк, Беларусбанк, Белагрtoprамбанк, таджыкскі банк Эсхата і казахстанскі АзіяКрэдыт банк. Сёлета за першае паўгоддзе абарот удзельнікаў інтэграванага валютнага рынку павялічыўся амаль у два разы ў параўнанні з аналагічным перыядам папярэдняга года і склаў 111 млрд рублёў.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■

■ Напярэдадні

Увага — на дарожны рух

Падчас святкавання Дня горада ў аўтамабілістаў могуць узнікнуць пэўныя нязручнасці. Праўда, як адзначыў намеснік начальніка ўпраўлення ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Андрэй ЗЫРАНАЎ, значнымі гэтыя абмежаванні не будуць.

— Асноўныя змены ў аўтамабільным руху ў горадзе адбудуцца 13 верасня падчас правядзення мінскага паўмарафону, — кажа Андрэй Зыранаў. — У сталіцы ўпершыню пройдзе такое значнае мерапрыемства з закрыццём руху на вялікай колькасці вуліц. Удзельнікаў забегаў даволі шмат, а таму ўчасткі, па якіх пабягуць, цалкам закрыюць для руху ўсіх відаў транспарту.

З 10:00 ён будзе закрыты па маршруце прабегу: праспект Пераможцаў — пр. Незалежнасці — вул. Валадарскага — вул. Карла Маркса — вул. Энгельса — пр. Незалежнасці — вул. Кісялёва — вул. Куйбышава — вул. Янкі Купалы — вул. Старажоўская — пр. Машэрава — пр. Незалежнасці.

Трэба ўлічваць, што ўжо з суботы паркавацца не дазволяць на вуліцах Карла Маркса і Камуністычнай. Нельга будзе пакінуць машыну таксама ўздоўж маршруту паўмарафону. Забегі завершацца ў 15:00, пасля чаго ўсе абмежаванні здымуць.

— У дні святкаванняў супрацоўнікі мінскай міліцыі будуць несці службу ва ўзмоцненым рэжыме, — паведамляе **намеснік начальніка ГУУС Мінгарвыканкама — начальнік міліцыі грамадскай бяспекі Іван КУБРАКОЎ.** — У месцах правядзення святочных мерапрыемстваў адпачывальнікаў будуць прапускаць праз кантрольна-прапускныя пункты з абавязковым аглядам. На кожным з іх правядуць відэадакументаванне. Падобныя меры накіраваны выключна на арганізацыю бяспекі нашых грамадзян.

На святочныя пляцоўкі міліцыя не пусціць тых, хто прыйшоў з хатнімі гадаванцамі, веласіпедам, мае пры сабе зброю, выбуховыя рэчывы, габарытныя рэчы, знаходзіцца ў стане ап'янення альбо мае пры сабе алкагольныя напоі.

Нагадаем, у Дзень горада ў Мінску пройдзе больш за 60 святочных мерапрыемстваў. Асноўнай пляцоўкай стане плошча каля Палаца спорту. Тут пройдзе вялікая канцэртная праграма з удзелам творчых калектываў і эстрадных выканаўцаў. Завершыцца свята феерверкам каля стэлы «Мінск — горад-герой» у 22:00.

Тарас ШЧЫРЫ. *taras@zviazda.by*

ПАВІНШАВАЦЬ БЛІЗКІХ З ДНЁМ ГОРАДА МОЖНА БУДЗЕ БЯСПЛАТНА

У дзевяці паштовых аддзяленнях сталіцы пройдзе святочная акцыя

11 верасня ўсе ахвотныя змогуць бясплатна атрымаць і адправіць паштоўкі з выявамі славутасцяў Мінска. Апроч таго, у межах свята мінчан чакае адкрыццё новага аддзялення па прыёме і выдачы паштовых адпраўленняў і цэнтра комплекснага абслугоўвання карпаратыўных кліентаў «Бізнес-пошта».

Спецыяльна да свята «Белпошта» распрацавала сувенірны штэмпель з выявай Мінскай гарадской ратушы. Маляўнічыя пасланні з добрымі пажаданнямі стануць арыгінальным падарункам напярэдадні Дня горада. Віншаванні адрасатам абяцаюць даставіць па ўсёй тэрыторыі краіны. Неабходна будзе толькі правільна пазначыць адрас. Акрамя таго, кліентам раскажуць, як правільна адрасаваць паштовыя адпраўленні, а таксама праінфармуюць пра магчымасць заказу паштовай прадукцыі, падарункаў і сувеніраў у каталогу тавараў беларускіх вытворцаў і паштовай інтэрнэт-краме shop.belpost.by.

Паўдзельнічаць у прома-мерапрыемстве можна будзе на Галоўпаштамце (пр-т Незалежнасці, 10), а таксама ў аддзяленнях паштовай сувязі №№ 3 (вул. Адзінцова, 113), 7 (вул. Жукоўскага, 6/2), 23 (пр-т Незалежнасці, 103), 29 (вул. Камуністычная, 3), 45 (вул. Напалеона Орды, 23), 70 (вул. Ванеева, 18), 75 (вул. Бачылы, 14), 123 (вул. Максіма Багдановіча, 23).

Яшчэ адным прыемным падарункам стане адкрыццё 15 верасня пункта па прыёме і выдачы паштовых адпраўленняў і цэнтра комплекснага абслугоўвання карпаратыўных кліентаў «Бізнес-пошта» па вул. Каралінскай, 10. Новы пункт па прыёме і выдачы паштовых адпраўленняў стане чацвёртым у Мінску. Тут будуць прымаць і выдаваць пасылкі і дробныя пакеты, што паступаюць па адрасах, якія знаходзяцца ў зоне абслугоўвання 25-га, 45-га і 116-га сталічных АПС. Спецыяльнае праграмнае забеспячэнне для ўліку і фіксавання размяшчэння паштовых адпраўленняў

на стэлажах дазволіць выдаваць іх адрасату ў мінімальныя тэрміны. З улікам пажаданняў кліентаў у пункце ўстаноўлены штодзённы рэжым працы: панядзелак — пятніца — з 8.00 да 21.00; субота, нядзеля — з 10.00 да 20.00.

Цэнтр комплекснага абслугоўвання «Бізнес-пошта» — гэта вылучаныя працоўныя месцы для прыёму і апрацоўкі пошты ад юрыдычных асоб, дзе спецыяліст па продажы паслуг якасна аформіць заказ і пракансультуе карпаратыўных кліентаў па любых напрамках. Тут створана асобная лінейка паслуг: прыём і апрацоўка паштовых адпраўленняў (пісьмовай карэспандэнцыі, пасылак, адпраўленняў паскоранай пошты EMS і інш.); рэалізацыя паштовак, канвертаў, марак, бланкаў строгай справаздачнасці; паслугі па раздрукоўцы, канвертаванні і рассылцы інфармацыі, атрыманай ад заказчыка ў электронным выглядзе (гібрыдная пошта, прамая паштовая рэклама); афармленне падпіскі на друкаваныя СМІ; прыём грашовых пераводаў; дастаўка паштовых адпраўленняў у офіс «Паштовым кур'ерам» ва ўзгоднены з кліентам час і інш.

Рэжым працы: панядзелак — пятніца — з 09.00 да 19.00, субота, нядзеля — выхадны. Новы цэнтр «Бізнес-пошты» стане ў Мінску 18-м.

Дзіяна СЕРАДЗЮК. *seradzyuk@zviazda.by*

■

■ Пасля падзеі

Хоць неяк рэабілітавацца

Як футбольная зборная перамагла каманду Люксембурга

У чарговым матчы адборачнага турніру чэмпіянату Еўропы нашы футбалісты атрымалі перамогу над зборнай Люксембурга — 2:0. Дублем адзначыўся нападаючы Міхаіл Гардзяйчук. Гэтая гульня нічога не вырашала з турнірнага пункту гледжання: наша нацыянальная каманда страціла шанцы патрапіць у фінальную частку кантынентальнага форуму пасля нядаўняга паражэння ад зборнай Украіны. Аднак як гульцы, так і трэнеры заявілі пра жаданне годна завяршыць адборачны цыкл, таму перамога ў паядынку была проста неабходна.

Матч на «Барысаў-Арэне» наведала антырэкордная колькасць балельшчыкаў для зборнай — 3482 гледачы. Адзначым, што перамога над зборнай Люксембурга стала першай вікторыяй на хатняй пляцоўцы за апошнія тры гады.

Аляксандр ХАЦКЕВІЧ, галоўны трэнер нацыянальнай зборнай:

— Самае галоўнае — вынік быў здабыты. Пасля матча ў Львове гэта выйшла на першы план. Мы надзейна згулялі ў абароне, нягледзячы на некаторыя агрэхі і «стандарты» каля нашых варот. Так, дапускалі шмат тэхнічнага браку пры пераходзе з абароны ў атаку. Многія атакі не даводзілі да лагічнага завяршэння: або затрымлівалі апошнюю перадачу, або шукалі лепшае рашэнне ў моманце, калі можна было наносіць удар. Тым не менш перамогу лічу заслужанай.

Не магу сказаць, што застаўся задаволены гульнёй Глеба ў гэтым матчы, не чакаў ад яго столькі тэхнічнага браку. Да таго ж перад стартам агаворвалі, што ў гэты раз і Сашу неабходна гуляць у адборы. Ну, здараецца: гульня не пайшла, хтосьці адпрацаваў за яго. Нічога страшнага. Пакуль быў «свежы» Станіслаў Драгун, добра дзейнічаў у адборы. Ад яго патрабавалася таксама пачынаць атакі, разгортваць іх: у Стаса добры сярэдні пас.

У наступным матчы са славакамі пастараемся набраць ачкі, ведаем, што зборныя Славакіі і Украіны падзяляюць тры балы, магчыма, атрымаецца дапамагчы ўкраінцам.

Паўабаронца Аляксандр ГЛЕБ:

— Ніякага задавальнення ад гульні няма. Мы не выканалі задачу, пастаўленую на цыкл. Перамаглі чыста для душы, каб рэабілітавацца. Тым не менш рады, што былі мацнейшымі і зарабілі тры ачкі. Дзякуй тым, хто прыйшоў на стадыён. Такіх людзей было няшмат, але ўсё роўна прыемна, што яны не адвярнуліся ад каманды. Будзем старацца завяршыць цыкл на добрай ноце.

Абаронца Ігар ШЫТАЎ:

— Не думаю, што мы неяк рэабілітаваліся. Для таго, каб вярнуць балельшчыкаў на трыбуны, патрэбна не адна гульня. У мінулым матчы з Люксембургам мы недаацанілі саперніка. Думалі, што паядынак нам удасца лёгка, але ў сучасным футболе трэба да кожнага саперніка падыходзіць са 100-працэнтнай канцэнтрацыяй.

Паўабаронца Рэнан БРЭСАН:

— Вядома, мы дамагліся не таго, чаго ад нас чакалі. Цяпер стаіць задача заняць чацвёртае месца. Калі мы набяром чатыры ачкі — будзе добры вынік, калі шэсць — выдатны.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

■

■ Ведай нашых!

БЯРОЗАЎСКІЯ КАСЦЫ ВЫЙГРАЛІ МІЖНАРОДНЫ ЧЭМПІЯНАТ

Бярозаўская каманда касцоў «Картузіянцы», якая ў жніўні стала пераможцай на «Спораўскіх сенакосах», нядаўна вярнулася з Польшчы з залатой узнагародай.

У Бебжанскім нацыянальным парку суседняй краіны адбыўся міжнародны чэмпіянат па ручным сенакашэнні. На спаборніцтвы ў названы парк традыцыйна прыязджаюць удзельнікі з краін Еўропы. На гэты раз былі касцы і з іншых кантынентаў. Напрыклад, каманда з Канады. Усяго паспаборнічаць у справе валодання традыцыйным вясковым інструментам сабраліся больш за 70 чалавек. І вось на гэтым прадстаўнічым форуме каманда «Картузіянцы» ў складзе Васіля Новіка і Віктара Здановіча заняла першае месца сярод камандаў прыродаахоўных устаноў. Васіль і Віктар прадстаўляюць заказнік «Спораўскі». Яго дырэктар Вадзім Пратасевіч кажа, што сваё майстэрства яны адтачылі менавіта падчас падрыхтоўкі і ўдзелу ў «Спораўскіх сенакосах».

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

■

ВНИМАНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОАО «СПМК № 127»

ОАО «СПМК № 127» сообщает об уменьшении своего уставного фонда.

Новый размер уставного фонда ОАО «СПМК №127» составит 101 160 000 белорусских рублей.

За дополнительной информацией и для предъявления требований о досрочном погашении обязательств обращаться по адресу: г. Минск, ул. Инженерная, 22, и по телефону: 8 (017) 344-53-22. УНП 100048018

Наблюдательный совет

ОАО «Универсам Рига»

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, которое состоится 9 октября 2015 года в 13.00 со следующей повесткой дня:

1. О заключении сделки, в совершении которой имеется заинтересованность аффилированного лица Общества.

Собрание состоится по адресу: **г. Минск, ул. Сурганова, 50, торговый центр «Рига».**

Регистрация участников собрания будет проводиться в день собрания **с 12.30 до 13.00.**

Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность; представителю акционера – доверенность и документ, удостоверяющий личность.

УНП 100299678 *Наблюдательный совет ОАО «Универсам Рига»*

ДОЙЛІДСТВА. СУЧАСНАЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЕ МАСТАЦТВА

Пачатак верасня ў нашай сталіцы можна без перабольшвання назваць архітэктурна-будаўнічым. На мінулым тыдні ўдзельнікаў і гасцей збіраў у Мінску XI Нацыянальны фестываль архітэктуры, акурат у гэтыя дні праходзіць XXIII Міжнародная спецыялізаваная выстава «Будпрагрэс», у якой прымаюць удзел больш за 250 айчынных і замежных будаўнічых кампаній.

І на адным, і на другім мерапрыемстве неаднойчы гучала думка, што цікавасць замежных патэнцыяльных партнёраў і інвестараў да беларускай будаўнічай галіны ўзрастае. Яно і не дзіва: на прасторах былога Саюза мала якая краіна можа пахваліцца такой колькасцю ўзведзеных квадратных метраў. Прычым не толькі дзеля вырашэння жыллёвага пытання, якое, несумненна, сярод галоўных прыярытэтаў сацыяльнай палітыкі дзяржавы. Кожны год на нашай зямлі дзякуючы творчаму падыходу і ўмелым рукам архітэктараў і будаўнікоў з'яўляюцца храмы, прамысловыя і спартыўныя аб'екты, збудаванні, якія становяцца візітоўкай горада ці наогул усёй краіны. Яны радуюць вока месцічаў і прыезджых і служаць людзям, для якіх, уласна, і ўзводзяцца.

Дойлід — слова, якое на нашай зямлі і сёння не стала архаізмам. Бо тых, хто робіць гэтую прыгажосць, варта называць менавіта так — урачыста-ўзвышана. І дойлідства як від мастацтва ў Беларусі жыве і развіваецца. Каб пераканацца ў гэтым, можна проста паглядзець на новабудоўлі апошніх пяці гадоў. Пагадзіцеся, паказаць патэнцыяльным інвестарам сапраўды ёсць што. Чым ганарыцца — таксама.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Новы будынак музея ўзведзены ў 2014 годзе. У рамках XI Нацыянальнага фестывалю архітэктуры «Мінск-2015» Гран-пры XVII Рэспубліканскага конкурсу на найлепшы архітэктурны твор 2014-2015 гадоў прысуджаны аўтарскаму калектыву творчай майстэрні архітэктара Віктара Крамарэнкі за аб'ект «Музей Вялікай Айчыннай вайны на праспекце Пераможцаў».

Сёння Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца адным з найбуйнейшых у свеце цэнтраў захоўвання сведчанняў Другой сусветнай вайны. З закладкі капсулы з пасланнем нашчадкам 24 красавіка 2010 года па ініцыятыве Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пачалося будаўніцтва сучаснага музейнага праекта. Плошча архітэктурнага ансамбля складае 7593 квадратныя метры. Будынак размяшчаецца паўколам на ўзвышшы каля абеліска «Мінск — горад-герой» і складаецца з 4 блокаў, якія сімвалізуюць 4 гады вайны.

Экспазіцыйная плошча новага збудавання складае 4200 квадратных метраў, колькасць экспазіцыйных матэрыялаў — больш за 8 тысяч музейных прадметаў і навукова-дапаможных матэрыялаў. Найважнейшай канцэптуальнай асновай экспазіцыі з'яўляецца адлюстраванне дружбы і ўзаемадапамогі народаў Савецкага Саюза ў барацьбе з фашызмам, паказ вырашальнай ролі Чырвонай Арміі ў Другой сусветнай вайне, уклад беларускага народа ў Перамогу.

Ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця новага будынка музея Вялікай Айчыннай вайны 2 ліпеня 2014 года прымалі ўдзел кіраўнік нашай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін.

ПАЛАЦ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

У кастрычніку 2013 года ў сталіцы нашай краіны адбылося адкрыццё Палаца Незалежнасці. У ім праходзяць асноўныя дзяржаўныя мерапрыемствы, а ўвогуле, гэты комплекс стаў цэнтрам суверэннай дзяржавы, прадметам гонару беларускіх грамадзян, візітнай карткай Беларусі. Цяпер Палац Незалежнасці — раскошнае архітэктурнае збудаванне Мінска. Будынак знаходзіцца на праспекце Пераможцаў, непадалёк ад выставачнага комплексу «БелЭкспа».

Сёння ў палацы праходзяць мерапрыемствы дзяржаўнай важнасці, такія як цырымонія ўручэння замежным паслам даверчых грамат або нарада кіраўнікоў замежных дзяржаў. Лідары «нармандскай чацвёркі» сваю сустрэчу па сітуацыі ва Украіне ў лютым 2015-га праводзілі менавіта тут. Побач з будынкам размяшчаецца плошча Дзяржаўнага сцяга, якая разам з палацам утварае адзіны архітэктурны комплекс і падкрэслівае непахіснасць дзяржаўнай незалежнасці.

Плошча Палаца Незалежнасці складае каля 50 тысяч квадратных метраў, а ў самім будынку налічваецца некалькі сотняў памяшканняў. Пры яго ўзвядзенні асаблівая ўвага была нададзена бяспецы рэзідэнцыі. Усе ўваходы ў палац абсталяваны арачнымі металадэтэктарамі і канвеерамі з рэнтгенам.

УСІХСВЯЦКІ ХРАМ

Афіцыйным адкрыццём храма лічыцца дата 2 ліпеня 2010 года, калі напярэдадні святкавання Дня Незалежнасці Беларусі ў крыпце (ніжняй алтарнай частцы храма) храма-помніка ў гонар Усіх Святых адбылася ўрачыстая цырымонія пахавання астанкаў трох невядомых салдат — воінаў Айчыннай вайны 1812 года, Першай сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гадоў. У мерапрыемствах прынялі ўдзел Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка і Мітрапаліт Філарэт, які вымавіў дазвольную малітву над нябожчыкамі і акрапіў іх астанкі святой вадой.

Храм Усіх Святых мае форму шатра, увянчанага крыжам. Яго вышыня — 72 метры, разам з крыжам — 74 метры (адзін з самых высокіх у СНД). Адначасова храм зможа прыняць 1200 вернікаў. У крыпце знаходзяцца 504 нішы, у кожнай з якіх размешчана крыштальная ёмістасць. У гэтыя ёмістасці збіраецца зямля з палёў усіх вялікіх гістарычных бітваў у абарону беларускай зямлі.

ЧЫЖОЎКА-АРЭНА

Гэта другая па велічыні пасля «Мінск-Арэны» лядовая пляцоўка Беларусі, якая была пабудавана менавіта да чэмпіянату свету па хакеі — 2014. Гэта не толькі адзін з найбуйнейшых спартыўных аб'ектаў краіны, але і ўніверсальны комплекс для актыўнага адпачынку і забаў.

Шматфункцыянальны культурна-спартыўны і забаўляльны комплекс «Чыжоўка-Арэна» размешчаны на паўднёвым усходзе сталіцы ў маляўнічым месцы на тэрыторыі парку імя 900-годдзя Мінска. У аснове праекта комплексу архітэктара Марата Гроднікава — вобраз дзвюх кропель вады, якія нібы перацякаюць адна ў адну: сучасны будынак са шкла і металу гарманічна ўпісваецца ў прыродны ландшафт Чыжоўскага вадасховішча.

Афіцыйнае адкрыццё «Чыжоўка-Арэны» — матч Беларусь — Францыя 25 снежня 2013 года, а ў студзені 2014-га гэтая пляцоўка ўпершыню прымала матчы вялікай падзеі — X Каляднага міжнароднага турніру аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Беларусі. Падчас чэмпіянату свету па хакеі «Чыжоўка-Арэна» прыняла 30 матчаў, у тым ліку два чвэрцьфіналы.

Сёння гэта ўніверсальны комплекс для топавых спартыўных падзей і буйных забаўляльных шоу, трэніровак спартсменаў і актыўнага адпачынку аматараў, прыемнага баўлення вольнага часу і шопінгу. Акрамя таго, «Чыжоўка-Арэна» — хатняя пляцоўка хакейнага клуба «Мінскае Юнацтва».

БАРЫСАЎ-АРЭНА

Летам 2010 года архітэктары Шпела Відзечнік і Рок Аман завяршылі працу над гэтым праектам. Ідэя славенскіх спецыялістаў унікальная. Гэта чыста футбольны стадыён, разлічаны на 12 548 гледачоў, які адпавядае патрабаванням чацвёртай катэгорыі УЕФА, што дазваляе гуляць у Барысаве не толькі паядынкі кваліфікацыйных стадый еўракубкаў, але і праводзіць сустрэчы групавога этапу і плэй-оф Лігі чэмпіёнаў і Лігі Еўропы.

Агульная колькасць гледачоў уключае ложу ганаровых гасцей больш чым на 600 чалавек. Яна злучана з распранальнямі галерэяй, якая апярэзвае віраж арэны. Прадугледжана і ёмістая ложа для прэсы, колькасць месцаў у якой можна рэгуляваць за кошт рухомых бар'ераў. 144 месцы абсталяваны столікамі, але агульная ўмяшчальнасць можа быць павялічана да 256. Вялікая ўвага пры распрацоўцы праекта была нададзена пытанням бяспекі. У выніку дызайн стадыёна ўлічвае апошнія патрабаванні УЕФА і ФІФА ў гэтым аспекце. Маецца дастатковая колькасць запасных выхадаў, колькасць сядзенняў у любым з радоў на сектары не перавышае 28. Усе выгоды створаны і для заўзятараў. Важная асаблівасць арэны — функцыянальная гнуткасць. У залежнасці ад колькасці прададзеных білетаў можна дабавіць дадатковыя мабільныя пункты харчавання і продажу атрыбутыкі. Гасцявыя фаны будуць заходзіць у свой сектар праз асобны ўваход без кантакту з гаспадарскай тарсідай. Летась 1 мая футбалісты БАТЭ першымі выйшлі на газон новенькай «Барысаў-Арэны» і правялі паўтарагадзінную трэніроўку. Усе былі ў захапленні. А праз два дні, 3 мая 2014 года, адбылося афіцыйнае адкрыццё «суперарэны». У ім прыняў удзел Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. У той жа дзень адбыўся першы афіцыйны матч — у фінале Кубка Беларусі згулялі гродзенскі «Нёман» і салігорскі «Шахцёр».

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

10 ВЕРАСНЯ 2015 г.
ЧАЦВЕР
№ 17 (15776)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Юныя імёны

«Заплакаў, даведаўшыся пра перамогу»

Руслан АСЛАНАЎ:



Сёлета на Міжнародным дзіцячым конкурсе «Еўрабачанне-2015» нашу краіну будзе прадстаўляць Руслан Асланаў. Хлопчык займаецца вакалам з дзяцінства і сёння ўжо мае шэраг дасягненняў. Напрыклад, на ўкраінскім шоу талентаў «Голас. Дзеці» стаў суперфіналістам, а ў мінулым годзе заняў трэцяе месца на дзіцячай «Новай хвалі». Мы сустрэліся з канкурсантам і яго маці. І ён расказаў, якой музыкай захапляецца, ці дапамагае яму артыстызм у вучобе і ў каго вучыцца быць сапраўдным мужчынам.

Нацыянальны адбор на конкурс «Еўрабачанне» ён пакарыў з другой спробы (папярэдняя была два гады таму). Выканаўшы песню «Чараўніцтва», юны артыст заваяваў сэрцы і журы, і тэлегледачоў і, атрымаўшы найвышэйшыя балы, перамог.

— Руслан, раскажы, як з'явілася песня і ці прысвечана яна камусьці канкрэтна?

— Мая кампазіцыя — гэта аповед пра чароўную сілу кахання. У мяне ёсць чалавек, якому я яе прысвячаю, але раскрываць сакрэтаў не стану. Ствараласяпесня ў суаўтарстве: я пісаў тэкст сумесна з Віталем Кураўскім, а музыку — Руслан Квінт.

— Што адчуваў, даведаўшыся пра перамогу?

— Я ішоў да гэтага два апошнія гады. Мы ўсе вельмі ўзрадаваліся, бо трапіць на такі конкурс — мара, можна сказаць, не толькі мая, але і маіх блізкіх. Калі пачуў вынік і зразумеў, што перамог, то эмоцыі былі проста неверагодныя. Я нават упершыню заплакаў.

— Ты памятаеш сваё хваляванне на першым сур'ёзным выступленні?

— Яно было вельмі вясёлым, мы выступалі з дзіцячым ансамблем «Буслік». Тады мне давалося спяваць пад фанаграму, чым страшэнна быў незадаволены. А першы сольны конкурс мой быў у Балгарыі — «Славянскі вянец». Увогуле з кожным праектам, конкурсам, канцэртам я назапашваю новы вопыт, як павінен паводзіць сябе артыст на сцэне. І з кожным годам усё больш камфортна там пачуваюся.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Сваімі рукамі

ЯК МІЦКЕВІЧ «ПАСЯБРАВАЎ» З СЫСАМ

Чаго толькі ні прыдумаюць разумныя галовы!

Пераважная большасць ідэй, якія змянілі і працягваюць змяняць сусвет, з'явілася ў галовах прадстаўнікоў маладога пакалення. Але добрая задума — гэта толькі палова поспеху, бо, сутыкаючыся з рэальнасцю, многія са стваральнікаў страчваюць веру ў свае сілы і спыняюць працу. Мы адшукалі тры ідэі, што былі рэалізаваны рознымі шляхамі і якія могуць натхніць вас на скарэнне новых вяршыняў.

АДЗІН У ПОЛІ — ГЕРОЙ

Самы надзейны і адначасова самы складаны шлях да рэалізацыі задумы — рабіць усё самому. Менавіта ім пайшоў праграміст Алег ХВЯДЗЬКОВІЧ. Хлопец даўно марыў займець праект, у межах якога ён мог бы прафесійна самаўдасканальвацца і развівацца. На ўласную ж ідэю Алега натхніў матэрыял у адной з газет, у якім распавядалі пра лёсы рэпрэсаваных у савецкія часы беларусаў.

— Мне падумалася, што было б цікава падаць інфармацыю пра славутых суайчыннікаў у нейкай незвычайнай форме, — расказвае праграміст. — Каб кожны мог зайсці на сайт і даведацца пра любую значную для нашай гісторыі персону. Калі пачаў рэалізоўваць задуму, зразумеў, што людзі не вельмі любяць чытаць класічныя энцыклапедычныя артыкулы. Скажам, у «Вікіпедыі» многія проста прагортваюць старонку, бо чытаць даўжэзны тэкст моладзі не падабаецца. Цікава іншае — глядзець малюнкі, нейкую візуалізаваную інфармацыю.

Пасля доўгіх разважанняў Алег прыйшоў да сапраўды незвычайнай формы падачы — ён стварыў... сацыяльную сетку, у якой вядомыя беларусы маюць свае старонкі. Стужка падзей, фотаздымкі, сябры, геалакацыі — тут ёсць усё звыклае для любога аматара бавіць час у «Фэйсбуку» ці «УКантакце». Праект атрымаў назву «Беларускія героі» і працуе ўжо амаль год.

— Ніякага прынцыпу адбору герояў для сайта не існуе, — кажа Алег. — Звычайна трапляюцца гісторыі людзей, пра якіх, на маю думку, варта было б ведаць. Я заношу гэтыя імёны ў спецыяльны спіс, і потым у іх з'яўляюцца свае старонкі. Спачатку імкнуўся рабіць анкеты найбольш вядомых асоб, каб павысіць наведвальнасць. Напрыклад, класікаў літаратуры, спартсменаў. Цяпер жа карыстальнікі часта дасылаюць мне гісторыі людзей, пра якіх я ўвогуле нічога не чуў.

Сёння на сайце амаль паўсотні лёсаў славутых беларусаў, прадстаўленых у выглядзе хронік. Ад Пятра Машэрава да Уладзіміра Дубоўкі, ад Уладзіміра Карвата да Аркадзя Смоліча, ад Вікторыі Азаранкі да князя Вітаўта. Падобныя па родзе дзейнасці героі звычайна знаходзяцца адзін у аднаго «ў сябрах», незалежна ад часу жыцця і рэальных адносін, напрыклад, у Адама Міцкевіча гэта паэты Дубоўка, Сыс, Жылка і іншыя.

— Усю тэхнічную працу па сайце я выконваю сам, — дзеліцца стваральнік. — Першым часам мне дапамагалі шукаць цікавую інфармацыю, але цяпер і з гэтым праблем няма. Вядома, можна было зрабіць усё па прынцыпе «Вікіпедыі», калі карыстальнікі самі маюць магчымасць рэдагавання. Але ў такім выпадку шмат часу ішло б на мадэрацыю і кантроль. Зрэшты, зусім нядаўна на мяне выйшлі адразу два чалавекі, якія вельмі прафесійна і якасна склалі артыкулы пра Уладзіміра Жылку, Уладзіміра Дубоўку, Ігната Дамейку, Анатоля Сыса і гэтым моцна мне дапамаглі, бо пошук інфармацыі займае шмат часу.

«Маленькі вадзяны мядзведзік і вялікія вадзяныя пчолы»

Грошы на ўтрыманне сайта Алег бярэ з уласнага бюджэту. Прыбыткаў праект не прыносіць, але для хлопца гэта не галоўнае — яму хочацца, каб як мага больш людзей маглі даведацца пра цікавае з жыцця беларускіх герояў.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Увага, конкурс!

або Да творчай «перазагрузкі» будзьце гатовы!

Напэўна, здзівіліся, убачыўшы назву чарговага творчага конкурсу для юных і маладых няштатных аўтараў, які на пачатку новага навучальнага года зноў абвяшчае «Чырвонка. Чырвоная змена»? Вы не памыляецеся: менавіта пад ёй праходзіла апошняе «спаборніцтва» «проб пяра» журналістаў-пачаткоўцаў. Гэтая назва была прыдумана напярэдадні Года моладзі і, як падаецца, найбольш удала сфармулявала тыя мэты і задачы, якія праследуе наш творчы конкурс, выступаючы ў якасці своеасаблівай пляцоўкі для самавыяўлення: даць юным і маладым аўтарам магчымасць расказаць пра сваю пазіцыю, пра стаўленне равеснікаў да тых ці іншых праблем, якія ўздымаюцца ў грамадстве, у тым ліку найперш у сферы маладзёжнай палітыкі, распавесці пра іх асабісты ўнёсак у тую ці іншую справу.

І вынікі апошняга «спаборніцтва» толькі пацвердзілі правільнасць выбару назвы: удзельнікі напоўніцу раскрылі тэму талентаў і здольнасцяў равеснікаў. Са старонак «Чырвонкі. Чырвонай змены» прагучалі аповеды пра юных эколагаў і турыстаў, спартсменаў і тэатральных акцёраў. У год 70-годдзя Вялікай Перамогі гаварылася пра захаванне памяці аб вызваліцелях. Былі матэрыялы пра дзіцячы парламент і аўтарскую песню, велабайкера з душой творцы. Прагучала нават «афрыканская тэма»: пра валанцёра, які дапамагаў дзецям на Чорным кантыненце! Улічваючы ўсё гэта, было вырашана пакінуць ранейшую назву творчага конкурсу. Засталіся без змен і ўмовы яго правядзення, якія былі «адшліфаваны» цягам некалькіх гадоў. Вялікая просьба да будучых юных і маладых аўтараў і іх кураторaў — уважліва азнаёмцеся з абавязковымі ўмовамі, якім павінны адпавядаць дасланыя работы.

Конкурс, як і папярэднія, разлічаны найперш на беларускамоўную моладзь, якая збіраецца паспрабаваць свае сілы ў журналістыцы, каб у далейшым, магчыма, звязаць сваё жыццё з гэтай прафесіяй. Нагадаем, што яго творчая планка даволі высокая, каб малады чалавек, які збіраецца прысвяціць сваё жыццё гэтай цікавай, але нялёгкай сферы, змог пакаштаваць «журналісцкага хлеба» і цвяроза ацаніць свае здольнасці.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
10 09 2015 г.

Крок да самастойнасці

Міхаіл ЖУРАЎКОЎ:

«КАРЫСТАЙЦЕСЯ ВАШЫМ ПРАВАМ ГОЛАСУ!»

Міжнародная студэнцкая канферэнцыя «Студэнцкае самакіраванне: вопыт і перспектывы развіцця» пройдзе 21—22 верасня на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Чакаецца, што ўдзел у канферэнцыі возьмуць лідары студэнцкіх арганізацый з краін СНД. Пра гэта стала вядома падчас пашыранага пасяджэння Грамадскага рэспубліканскага студэнцкага савета, удзел у якім узялі міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ, рэктар БДУІР Міхаіл БАТУРА і начальнік упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Наталля ПШАНІЧНАЯ.

Нагадаем, што рэспубліканскі студэнцкі савет быў створаны ў пачатку бягучага года для развіцця студэнцкіх ініцыятыў і аператыўнага вырашэння праблем і пытанняў студэнцтва. Міхаіл Жураўкоў выказаў надзею, што члены рэспубліканскага савета ўжо сталі ў сваіх універсітэтах добрымі памочнікамі для адміністрацыі.

У гутарцы са студэнцкімі актывістамі міністр адукацыі расказаў, што апошнім часам сур'ёзна займаўся кадравымі пытаннямі, сустракаўся з рэктарамі, цікавіўся, як яны збіраюцца жыць далей.

— Насцярожвае, што некаторыя метады навучання ў нашых універсітэтах не нацэлены на перспектыву. Сёння трэба ўкараняць новыя спецыяльнасці, інавацыйныя тэхналогіі. Мяняецца мысленне, узрастае ўзровень жыцця, — падзяліўся сваімі развагамі Міхаіл Жураўкоў. — Нядаўна я вярнуўся з Бразіліі, з сусветнага чэмпіянату прафесійнага майстэрства WorldSkills. Тыя кампетэнцыі, якія былі прадстаўлены на чэмпіянаце іншымі краінамі, у нас, на жаль, нават не разглядаюцца, у вядучых тэхнічных ВНУ краіны такіх спецыялістаў не рыхтуюць.

У найбліжэйшых планах кіраўніка ведамства — наведаць студэнцкія саветы ўніверсітэтаў, пагутарыць з самай актыўнай часткай студэнцтва пра тое, што сабой уяўляе сучасны ўніверсітэт, разгледзець пытанні вылучэння моладзі на кіруючыя пасады.

«Вы маеце права голасу ва ўніверсітэце, вас ведаюць студэнты, адміністрацыя ВНУ. Трэба стварыць базу таленавітай моладзі, якая можа быць кіраўнікамі: маладых людзей, якія ўмеюць захапіць, павесці за сабой, зарыентаваць на якасны вынік. У кожнага з вас ёсць здаровыя амбіцыі, чаму б іх не рэалізаваць?» — задаў зусім не рытарычнае пытанне Міхаіл Жураўкоў.

— Прызнаюся, я знаходжуся пад уражаннем ад наведвання нацыянальнага дзіцячага цэнтра «Зубраня». Сустракаўся там са школьнікамі, якія прыбылі на летнюю змену як пераможцы рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд. Сярод іх ёсць вельмі талковыя хлопцы і дзяўчаты, а ёсць і тыя, чые развагі мяне насцярожылі. Напрыклад, пераможца алімпіяды па хіміі ўпэўнена заявіў: «Хутчэй за усё, у БДУ паступаць не буду. Чаму мяне там навучаць? Ды я і так усё ведаю, у нашай краіне я — самы лепшы хімік». Іншы ўдзельнік міжнароднай алімпіяды па біялогіі сказаў, што пойдзе ў медыцынскую ВНУ. Я здзівіўся, пытаюся, чаму б не заняцца навукай, генетыкай, біяінфарматыкай, на што атрымаў сустрэчнае пытанне — а колькі за гэта плацяць? Ідзе падмена каштоўнасцяў. На першы план выносіцца матэрыяльны фактар. А так быць не павінна. Калі чалавек у першую чаргу думае пра грошы, то з яго толку не атрымаецца. Каб чагосьці ў гэтым жыцці дасягнуць, трэба прыкласці максімум намаганняў. Нельга ісці на повадзе ў сваіх амбіцый, лічыць сябе выключнай асобай. У зносінах з малодшымі вы павінны нам дапамагчы, — канстатаваў Міхаіл Жураўкоў.

На думку міністра, вельмі важнай праблемай з'яўляецца наяўнасць у моладзі духоўнага стрыжня. У свеце адбываюцца катаклізмы, войны, эканамічныя крызісы. Мы не жывём у ізаляваным грамадстве. У кагосьці з маладых людзей назіраецца разгубленасць: хто мы такія, куды ідзём і што нам рабіць?

«Каб чагосьці ў гэтым жыцці дасягнуць, трэба прыкласці максімум намаганняў. Нельга ісці на повадзе ў сваіх амбіцый, лічыць сябе выключнай асобай».

— У маладых павінна быць выразная грамадзянская пазіцыя, як мы, беларусы, бачым сябе ў агульнай еўрапейскай прасторы, — падкрэсліў міністр. — Вельмі дрэнна, калі чалавек не верыць у сваю будучыню, не бачыць перспектыў. Нашых замежных гасцей прыемна здзіўляе патрыятызм беларускай моладзі. Студэнты выступаюць за Беларусь, за захаванне нацыянальнай самабытнасці. І гэта правільна. Вам, маладым, жыць тут далей, тварыць гісторыю, выхоўваць дзяцей.

Кіраўнік ведамства расказаў, што пасля ўступлення Беларусі ў Балонскі працэс, вышэйшую школу чакаюць пэўныя змены. У прыватнасці, плануецца перайсці на крэдытна-модульную сістэму навучання.

Сёння веды старэюць вельмі хутка. Таму пажадана даць выпускніку адносна шырокую падрыхтоўку і навучыць яго папаўняць і абнаўляць свае веды, уменні і навыкі па меры неабходнасці. Менавіта на такую падрыхтоўку нацэлены бакалаўрыят (у розных краінах падрыхтоўка бакалаўраў вядзецца 3-4 гады). Пры гэтым бакалаўрыят дае закончаную вышэйшую адукацыю, выпускнік з дыпломам бакалаўра можа прэтэндаваць на адпаведныя штатныя пасады. Магістратура (падрыхтоўка яшчэ на працягу года-двух) прадугледжвае больш вузкую і глыбокую спецыялізацыю, часта магістрант арыентуецца на навукова-даследчую або выкладчыцкую працу.

Пры модульнай сістэме навучання выкарыстоўваецца рэйтынгавая ацэнка ведаў, уменняў і навыкаў, пры якой улічваюцца ўсе віды вучэбнай дзейнасці студэнта (аўдыторнай і пазааўдыторнай), якія ацэньваюцца пэўнай колькасцю балаў. Ёсць абавязковыя прадметы, спецкурсы і курсы па выбары. За ўвесь час вучобы трэба набраць пэўную колькасць крэдытаў. Дзейнічае права выбару. Можна здаць пэўны прадмет на працягу года або праз 2-3 гады. Можна таксама праслухаць гэты курс у іншай ВНУ ў пэўнага прафесара, а затым яго здаць. Такім чынам, з'яўляецца зацікаўленасць студэнтаў у паспяховым засваенні кожнага элемента навучальнага плана.

У Балонскай дэкларацыі асаблівая ўвага надаецца сучаснаму падыходу да прафесійнай адукацыі: маюцца на ўвазе бесперапыннасць, пастаяннае павышэнне кваліфікацыі і навучанне на працягу ўсяго жыцця.

Міхаіл Жураўкоў паведаміў, што сёлета плануецца ўкараніць сеткавую арганізацыю навучання, якая ахопіць і каледжы (каб зрабіць іх больш прывабнымі для выпускнікоў). Можна будзе, напрыклад, паступіць у Баранавіцкі ўніверсітэт, але пры жаданні прыехаць на семестр у мінскі або гомельскі ўніверсітэты на навучанне.

У рамках мерапрыемства былі падведзены прамежкавыя вынікі працы рэспубліканскага студэнцкага савета за паўгоддзе — рэалізацыя праекта «Адукацыя вачыма моладзі» і «Пытанне міністру адукацыі». Даволі актыўна прайшло абмеркаванне найбліжэйшых планаў і новых праектаў, уключаючы распрацоўку Канцэпцыі развіцця студэнцкага самакіравання ў Рэспубліцы Беларусь, праект «Нашы людзі» і правядзенне міжнародных вэбінараў.

Членам рэспубліканскага студэнцкага савета расказалі аб праекце, скіраваным на падтрыманне здароўя студэнтаў — «Мой стыль жыцця сёння — мае здароўе і поспех заўтра!», які ўжо два гады з поспехам рэалізуецца ў БДУІР. Студсавет падтрымаў ідэю праекта, і многія прадстаўнікі ВНУ адразу пацвердзілі сваю гатоўнасць у рэалізацыі падобнай ідэі ў сваёй альма-матар.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

А некалі ў не марылі...

ВУЧОБА АНЛАЙН

і для дзяцей, і для педагогаў

У Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі адкрыўся навукова-адукацыйны цэнтр «БДУІР-Prestigio», дзе будуць займацца павышэннем камп'ютарнай асветы педагогаў. Гэта адзін з этапаў інфарматызацыі адукацыі.

У 2013 годзе ў сталіцы быў запушчаны эксперыментальны праект «Электронная школа». Гімназія №40 ужо трэці год паспяхова рэалізуе гэту задуму.

— Калі ў нашай школе пачалі карыстацца электроннымі журналамі і дзённікамі, вучні сталі глядзець на настаўнікаў па-іншаму. У іх вачах мы цяпер больш «прасунутыя», — дзеліцца сваімі думкамі **настаўніца інфарматыкі Алена ДАНІЛЬЧЫК.** — Педагог не проста задае вучням хатняе заданне, але можа далучаць да яго, напрыклад, электронны дакумент ці відэа. Адзнаку можа суправаджаць каментарый, каб бацькі разумелі, чаму настаўнік менавіта так ацаніў іх дзіця.

Схаваць дрэнную адзнаку ці сказаць «Нам нічога не задавалі» цяпер немагчыма. У электронныя журналы і дзённікі бацькі могуць зазірнуць нават з тэлефона ў любы час.

Але існуе ў «Электроннай школы» і адзін недахоп: настаўнікам даводзіцца выконваць двайную працу — яны запаўняюць не толькі электронныя, але і папяровыя журналы. Алена Данільчык тлумачыць гэта тым, што дагэтуль праект лічыўся эксперыментальным, і спадзяецца, што ў хуткім часе ад «паперы» яны адмовяцца.

Настаўніца хіміі з 40-й гімназіі Алена КАВЕШНІКАВА ўзгадвае першыя тыдні працы ў новым рэжыме:

— Невялікія складанасці з выкарыстаннем электронных журналаў узніклі, напэўна, толькі ў педагогаў перадпенсійнага ўзросту, але з цягам часу і яны зразумелі, што да чаго. Акрамя гэтага, распрацоўшчыкі дадаюць новыя функцыі, каб спрасціць нашу працу і дапамагчы дзецям і бацькам.

Пакуль што да праекта далучыліся толькі 12 установ адукацыі, таму БДУІР разам з Міністэрствам адукацыі і кампаніяй ASBIS (прадстаўнік брэнда Prestigio ў Беларусі) і вырашылі адкрыць навукова-адукацыйны цэнтр. Ён уяўляе сабой памяшканне з інтэрактыўнай дошкай і 12-цю персанальнымі планшэтнымі камп'ютарамі.

Рэктар БДУІР Міхаіл БАТУРА падкрэслівае, што адкрыццё навукова-адукацыйных цэнтраў ужо стала ва ўніверсітэце добрай традыцыяй.

— Але гэты цэнтр будзе асаблівым. Адметнасць «БДУІР-Prestigio» ў тым, што працаваць ён будзе на рэспубліканскім узроўні: тут мы будзем вучыць не нашых студэнтаў, а настаўнікаў школ з усёй краіны.

Дырэктар ASBIS, прадстаўнік брэнда Prestigio ў Беларусі Ігар КУЗЬМІЧ звярнуў увагу на тое, што сучасныя педагогі не заўжды настолькі дасведчаныя ў інфармацыйных тэхналогіях, як сучасныя дзеці. Таму адной з задач цэнтра будзе збліжэнне настаўнікаў і вучняў у плане авалодання ІТ. Тады і зацікаўленасць на ўроках вырасце, і засваенне матэрыялу палепшыцца...



— У сферы ІТ трэба мець не толькі добры інструмент, але і магчымасці для яго эфектыўнага выкарыстання. Толькі калі ёсць кваліфікаваны персанал (і карыстальніцкі, і абслуговы), можна казаць, што сістэма працуе паспяхова, — упэўнены **першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ.**

Вадзім Богуш расказаў, што літаральна днямі быў аб'яўлены конкурс на стварэнне новага пакалення падручнікаў дапаможнікаў, у якіх будзе прадугледжана і выкарыстанне мультымедыя. Таксама ён узгадаў пра развіццё пляцоўкі з электроннымі рэсурсамі для школ на базе Нацыянальнага інстытута адукацыі.

Падрабязнасцямі працы навукова-адукацыйнага цэнтра падзяліўся **Павел ЛІС, намеснік прарэктара БДУІР па навуковай дзейнасці.** Ён расказаў, што навучанне будзе праходзіць і непасрэдна ў самім цэнтры, будуць арганізоўвацца таксама выезды ў школы і дыстанцыйныя анлайн-заняткі. Тут створаць платформу для размяшчэння відэаўрокаў і электронных падручнікаў. Таксама сёлета на базе «БДУІР-Prestigio» плануецца стварэнне вэбсістэмы. Яе мэта — ацэньваць сайты ўстаноў адукацыі і тэсціраваць настаўнікаў. Сайты будуць тэсціравацца на бачнасць, колькасць старонак і якасць кантэнту для прагляду і спампоўвання. А педагогаў будуць тэсціраваць на веданне інфармацыйных тэхналогій.

На мерапрыемстве прысутнічала шмат прадстаўнікоў сталічных школ. Напрыклад, **Анжаліка АНАНІЧ, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце мінскага ліцэя №1**, прыйшла на адкрыццё «БДУІР-Prestigio», паколькі іх навучальная ўстанова таксама хоча перайсці на выкарыстанне электронных дзённікаў і журналаў: «Гэта сучасна, а калі ўлічваць, што ў ліцэі вучацца толькі дзесяцікласнікі і адзінаццацікласнікі, якія не ўяўляюць сваё жыццё без інфармацыйных тэхналогій, то нам без гэтага не абысціся. Да таго ж, дзякуючы БДУІРу, у нас з'явіўся клас відэаканферэнцсувязі, таму мы зможам навучацца ў цэнтры дыстанцыйна».

Ганна КУРАК,
студэнтка IV курса
Інстытута журналістыкі БДУ.

З базай у галаве

КОД ПАТРЫЯТЫЗМУ

ПІСАЦЬ ЯГО ЛЕПШ НА РАДЗІМЕ

На жаль, паспяховая моладзь нярэдка шукае для сябе лепшай будучыні па-за межамі краіны. Вядома, многія хочуць атрымаць прэстыжную адукацыю, якая адразу ж дасць дарогу ў вялікае жыццё. Але ёсць і іншыя прыклады — сёлета адзінаццацікласнік з Іўя Аляксей ВІСЦЯЖ заваяваў бронзу на міжнароднай алімпіядзе па інфарматыцы. Месцам будучай вучобы хлопец выбраў беларускую ВНУ.

— Аляксей, раскажы, калі ты зацікавіўся інфарматыкай?

— Усё, вядома, пачалося з камп'ютара. Бацькі мне яго падаравалі, калі я вучыўся ў пятым класе. Спачатку, зразумела, увесь мой інтарэс заключаўся ў камп'ютарных гульнях, я не бачыў іншага прымянення для свайго ПК. Але потым стала цікава: а што ж там усярэдзіне, як гэта працуе?.. Сам навучыўся пераўсталёўваць Windows, разбіраўся ў камп'ютарнай «начынцы». Але аб праграмаванні размовы не ішло.

Нейкі талент да напісання кодаў ува мне разгледзелі ўжо ў школе. З усіх прадметаў найбольш мне падабаліся матэматыка і фізіка, пазней — інфарматыка. Нават удзельнічаў у школьных алімпіядах. Настаўнік Васіль Вацлававіч Кеўра ў сёмым класе заўважыў, што я вельмі хутка цямлю, што да чаго, калі справа датычыцца задач па інфарматыцы, і прапанаваў мне больш актыўна займацца гэтай дысцыплінай. Праз год узяў удзел у сваёй першай алімпіядзе па гэтым прадмеце — школьнай. Заняў чацвёртае месца і паехаў выступаць на раён. А там ужо стаў пераможцам, бо старэйшыя вучні, якія былі найлепшымі ў школе, адправіліся на міжнародны конкурс у Санкт-Пецярбург.

Беларуская каманда на алімпіядзе ў Казахстане. Аляксей — *чацвёрты злева.*

— Ужо тады вырашыў, што звяжаш сваё жыццё з праграмаваннем?

— Так. Мне падабаецца рашаць задачы па інфарматыцы, хоць вельмі цяжка патлумачыць, што ў гэтым захапляльнага. Цікава знаходзіць рашэнне для таго, што спачатку здаецца невырашальным, потым бачыць вынік. Ды і сам працэс зацягвае — калі ты сам-насам з камп'ютарам, і толькі ад таго, як думае твая галава, залежыць вынік. Трэба ўвесь час удасканальвацца, шукаць новыя шляхі, асвойваць новыя прыёмы. Рух наперад прыносіць задавальненне.

— Якія ўражанні засталіся ад удзелу ў міжнароднай алімпіядзе па інфарматыцы ў Казахстане?

— Неверагодныя. Па-першае, спадабаўся высокі ўзровень, на якім праводзіліся спаборніцтвы: усё было проста шыкоўна. Па-другое, гэта ўражанні ад краіны. Алматы — вельмі прыгожы і акуратны горад. Мы хадзілі ў тамтэйшы цырк, былі на экскурсіі ў гарах (я першы раз у жыцці пабываў на сапраўднай гары), ну і проста гулялі. Адзіны мінус — неверагодная спёка, там зусім іншы клімат. А яшчэ мяне ўразілі самі казахі. Калі ехаў туды, думаў, што яны ўсе размаўляюць па-руску. Але аказалася, што жыхары краіны захоўваюць сваю культуру і мову — амаль усе казахі, якіх мы бачылі, паміж сабой гаварылі па-казахску.

— А самі спаборніцтвы апраўдалі твае чаканні?

— Хутчэй за ўсё, я сам іх не апраўдаў. Бо летась на такой жа алімпіядзе ў Тайвані ў мяне быў сярэбраны медаль, а цяпер толькі бронзавы. Хочацца росту, а атрымалася наадварот. Але да арганізатараў пытанняў няма — заданні цікавыя, хоць і складаныя.

— Пасля той алімпіяды цябе запрашалі вучыцца за мяжу, але ты адмовіўся...

— Так, запрашалі ў Санкт-Пецярбургскі ўніверсітэт ІТМО, але гэта, хутчэй, дзякуючы іншай алімпіядзе, якая праводзілася на пачатку года ў Санкт-Пецярбургу, дзе я перамог. Было яшчэ некалькі ВНУ ў Расіі, куды я мог паступіць без экзаменаў. Але мне не вельмі хочацца некуды з'язджаць. Увогуле, ёсць такое меркаванне, з якім я згодны, што праграмісту не важна, дзе вучыцца. Таму я вырашыў не шукаць нейкага шчасця за мяжой, а застацца на радзіме. Паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі на спецыяльнасць «інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» факультэта камп'ютарных сістэм і сетак.

— А якой цяпер бачыш сваю будучыню?

— Ёсць два шляхі. Можна працягваць займацца алімпіядамі. Іх вартасць у тым, што падарожнічаеш па свеце, знаёмішся з цікавымі людзьмі. Фіналістаў студэнцкіх алімпіяд нярэдка запрашаюць на стажыроўкі ў буйныя кампаніі па ўсім свеце. Другі шлях — паспрабаваць рэалізаваць свой праект, калі ёсць нейкая задума. Мяне, напрыклад, натхняе гісторыя Джона Кармака, легендарнай асобы для распрацоўшчыкаў камп'ютарных гульняў. Па чутках, гэты праграміст у адзіночку напісаў рухавік для першай часткі Doom. Застануся я далей у Беларусі або не, залежыць ад таго, ці атрымаецца знайсці цікавую работу з добрым заробкам. Але грошы для мяне не на першым месцы, бо я нават за вялікую зарплату не буду займацца тым, што мне нецікава.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

«Я — МАЛАДЫ. І МНЕ НЕ УСЁ РОЎНА!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Зноў жа традыцыйная просьба: не пішыце матэрыялы агульнымі словамі, не разважайце пра агульнавядомае. Раскажыце пра канкрэтную падзею, мерапрыемства, якое арганізавала моладзь, каб выказаць сваю неабыякавасць да той ці іншай праблемы ці сітуацыі. Знайдзіце канкрэтных маладых людзей, якія праз справы паказалі такі прыклад.

Па выніках конкурсу пераможцы атрымаюць памятныя прызы. Для тых з іх, хто налета збіраецца паступаць на факультэт журналістыкі, рэдакцыя дасць яшчэ і рэкамендацыі. Конкурс будзе доўжыцца да 1 мая (дата адпраўкі матэрыялаў). Найлепшыя творчыя работы (у залежнасці ад колькасці, якая паступіць) «Чырвонка. Чырвоная змена» можа працягваць друкаваць і надалей. **Вынікі плануецца падвесці ДА ПАЧАТКУ ЎСТУПНАЙ КАМПАНІІ.**

Матэрыялы на конкурс можна дасылаць на электронны адрас konkurschz@mail.ru або на паштовы (220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, рэдакцыя газеты «Звязда») з абавязковай пазнакай «Я — малады. І мне не ўсё роўна!»

Абавязковыя ўмовы, якім павінны адпавядаць конкурсныя работы:

1. «Проба пяра» павінна быць ТОЛЬКІ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ.

2. Тэксты дасылаюцца ў фармаце RTF (калі па пошце, дык у раздрукаваным выглядзе, а фотаздымкі — на дыску).

3. Кожная ілюстрацыя ці фотаздымак да тэксту дасылаецца АСОБНЫМ прымацаваным файлам.

4. Аб'ём конкурсных работ — не больш за 8 тысяч знакаў (з прабеламі).

5. Колькасць «проб пяра» ад аднаго аўтара не абмежавана, аднак пры вялікай колькасці конкурсных работ кожнаму ўдзельніку (пры ўмове належнай якасці матэрыялаў і адпаведнасці ўмовам конкурсу) даецца па адным шанцы. Астатнія яго матэрыялы будуць надрукаваны (зноў жа пры ўмове належнай іх якасці) як звычайныя журналісцкія — па-за конкурсам.

6. Узрост удзельнікаў таксама не абмежаваны, але найперш конкурс разлічаны на навучэнцаў старшых класаў.

7. Жанр «проб пяра» — любы, але гэта павінна быць толькі проза (нататка, рэпартаж, эсэ, замалёўка, інтэрв'ю).

8. Пажадана, каб матэрыял быў напісаны спецыяльна для конкурсу. Вялікая просьба не дасылаць школьных сачыненняў, рэфератаў (і па форме, і па змесце), асабліва падрыхтаваных колькі часу таму. На пачатку тэксту павінен быць загаловак (назва конкурсу не з'яўляецца такім), напрыканцы — імя і прозвішча аўтара.

9. Аўтар абавязаны пазначыць свае пашпартныя звесткі (нумар і серыя, ідэнтыфікацыйны нумар, кім і калі быў выдадзены дакумент, імя, імя па бацьку, прозвішча) і хатні паштовы адрас (індэкс, населены пункт, вуліца, дом). Гэтыя звесткі будуць патрэбны для бухгалтэрыі ў выпадку, калі «проба пяра» будзе надрукавана ў газеце. ТОЛЬКІ яны падаюцца аўтарам на БЕЛАРУСКАЙ і РУСКАЙ мовах. У выпадку, калі ў маладога ці юнага аўтара яшчэ няма

Пераможцы мінулага творчага конкурсу Лізавета Карповіч і Віктар Есін.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

пашпарта, вышэйназваныя звесткі падаюцца на аднаго з бацькоў, настаўніцу, кіраўніка гуртка (звесткі з пасведчання аб нараджэнні для бухгалтэрыі не падыходзяць).

10. Апроч таго, аўтар паведамляе СВОЙ нумар мабільнага або хатняга тэлефона, каб рэдакцыя ў выпадку неабходнасці магла аператыўна з ім звязацца.

11. Павінна быць пазначана поўная колькасць гадоў аўтара на момант адсылання конкурснай работы, нумар школы і класа.

12. Аўтар павінен паведаміць крыху дадатковай інфармацыі пра сябе (10-15 радкоў) у адвольнай форме. Напрыклад, якія і ў чым мае дасягненні (вучоба, спорт, мастацтва і г.д.), чым захапляецца ў вольны час, кім марыць стаць у будучыні і інш.

13. Калі дасланыя матэрыялы не падыходзяць да друку, яны не рэцэнзуюцца.

14. Пра канчатковую дату падвядзення вынікаў творчага конкурсу рэдакцыя паведаміць дадаткова. Адсочваць публікацыю «проб пяра» павінны самі юныя і маладыя аўтары або іх куратары (бацькі, настаўнікі, кіраўнікі гуркоў).

❍ ❍ ❍

Ну што ж, напрыканцы наша заўсёднае: «вастрыце пёры», аўтары! Зычым усім творчых поспехаў і перамог! Як мы паўтараем, паверце, прайграўшых у конкурсе не будзе!

Куратары праекта Надзея НІКАЛАЕВА і Сяргей РАСОЛЬКА.
nikalaeva@zviazda.by, rs@zviazda.by

Праз стагоддзі

«Я ЎДЗЯЧНАЯ ПРОДКАМ ЗА МОВУ...»

Разважаючы пра лёс мовы, немагчыма не закрануць гісторыю Беларусі. Бо цягам змены пакаленняў змяняліся і правілы беларускай мовы, і стаўленне да яе з боку народа і ўлады. Сучасная беларуская мова з'яўляецца паслядоўніцай старабеларускай, якая актыўна выкарыстоўвалася, калі Беларусь знаходзілася ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. У той час друкаваліся першыя кнігі, на роднай мове вялося справаводства, ёю карысталіся ў судовай сістэме. Аднак з прычыны аб'яднання ВКЛ з Каралеўствам Польскім у адзіную дзяржаву — Рэч Паспалітую — яна пачала страчваць дзяржаўны статус.

У гэты час актыўна распачаўся працэс паланізацыі, якая прывяла да таго, што мова была практычна забаронена для выкарыстання ў афіцыйных дакументах. Але нават тады яна не знікла канчаткова: хоць арыстакратыя і адвярнулася ад мовы, тая працягвала існаваць, але выкарыстоўвалася галоўным чынам сярод сялян. Становішча не вельмі змянілася і пасля ўваходжання Беларусі ў склад Расійскай імперыі. Толькі ў канцы XIX стагоддзя мова загучала на літаратурным узроўні, пачалі сваю дзейнасць славутыя беларускія пісьменнікі: Якуб Колас, Янка Купала, Максім Багдановіч... З'явіліся першыя беларускія выданні. Пераломным момантам у працэсе развіцця мовы стаў перыяд беларусізацыі, якая адбылася у 20-я гады XIX стагоддзя — мова нашага народа пачала замацоўваць сваё права на існаванне. Але толькі ў 1990 годзе быў прыняты закон «Аб мовах Беларускай ССР», тады беларуская мова набыла нарэшце афіцыйны статус.

Цяпер у Беларусі дзве дзяржаўныя мовы — беларуская і руская. Але нячаста сустрэнеш беларускамоўнага чалавека. Мова нашых продкаў сёння стала нямоднай, некаторыя лічаць яе проста не прыстасаванай для выкарыстання ў сучасным жыцці. Чыстую літаратурную мову можна пачуць ці ў сталіцы ад беларускамоўнай інтэлігенцыі, ці ад настаўнікаў, якія яе выкладаюць у школах.

У большасці выпадкаў людзі проста не разумеюць прыгажосці роднай мовы. А каб пераканацца ў тым, што яна вартая павагі, дастаткова ўсяго толькі прачытаць творы айчынных аўтараў. Акрамя вышэй згаданых заснавальнікаў сучаснай беларускай літаратуры, у нас ёсць такія выдатныя паэты і празаікі, як Максім Танк, Уладзімір Дубоўка, Максім Гарэцкі, Алаіза Пашкевіч і яшчэ шмат іншых — усе яны з'яўляюцца дзівоснымі майстрамі мастацкага слова, іх творы выхоўваюць у нас патрыятызм, павагу да Радзімы, пачуццё гонару за Беларусь і беларусаў, уменне бачыць прыгажосць вакол сябе. «Пявучая», «мілагучная» — вось якія словы прыходзяць на розум, калі я чую словазлучэнне «беларуская мова». На беларускія вершы лёгка кладзецца музыка. Прыгадайце хаця б песні з рэпертуару такога цудоўнага музычнага калектыву, як «Песняры», які добра вядомы і любімы ва ўсіх краінах постсавецкай прасторы.

Егіпецкая, шумерская, этруская, асманская... Усе гэтыя мовы аб'ядноўвае адно — яны мёртвыя, усе яны выйшлі з ужывання, былі замененыя на іншыя. Наш абавязак — не дапусціць, каб доўгі спіс памерлых папоўніўся яшчэ і беларускай.

Я шчыра ўдзячная продкам за тое, што, нягледзячы на ўсе нягоды, яны здолелі захаваць і пранесці нашу цудоўную мову праз стагоддзі, каб мы, нашчадкі, змаглі ацаніць усю моц, усю веліч душы беларускага народа. Скончыць хачу словамі вялікага беларускага паэта Пімена Панчанкі:

Ці плачу я, ці пяю,
Ці размаўляю з матуляю —
Песню сваю, мову сваю
Я да грудзей прытульваю.

Ганна СМІЛЕВІЧ, вучаніца 11-га класа СШ №4 г. Іванава.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
10 09 2015 г.

Нябачныя масты

ТУТ ВУЧАЦЬ БЕЛАРУСЬ ЛЮБІЦЬ...

Чарговая лекцыя... Студэнты абмяркоўваюць з выкладчыкам беларускую літаратуру. Закранаюць пытанне адрознення твораў літаратараў з Заходняй Беларусі і БССР у 20-я — 30-я гады мінулага стагоддзя. Супастаўляюць лёсы Францішка Аляхновіча і Лукаша Калюгі. Здавалася б, звычайная пара, скажам, на філалагічным факультэце. Толькі вось усе гэтыя студэнты — замежнікі: яны прыехалі ў Мінск на два тыдні, каб вывучаць беларускую мову і культуру падчас Міжнароднай летняй школы беларусістыкі, якую сёлета праводзяць Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

— Беларуссю я зацікавіўся вельмі даўно, — дзеліцца **Адам ФАЛБЕР** з Чэхіі. — Нават не ведаю, з чым гэта звязана, нібыта нейкі лёс. Калі ўзгадваць канкрэтны эпізод з жыцця, то яшчэ ў школе сем гадоў таму мне давялося рыхтаваць прэзентацыю пра Беларусь. Тады я заўважыў, што па-чэшску знайсці нешта пра вашу краіну вельмі цяжка. У інстытуце займаюся вывучэннем Усходняй Еўропы, пішу дыпломную працу на тэму традыцыйнай і сучаснай дзяржаўнай сімволікі Беларусі, за гэтым сюды і прыехаў.

Фота Надзеі БУЖАН.

Адам Фалбер (справа) і валанцёры.

Акрамя геральдыкі Адам вывучае беларускую гісторыю, культуру і традыцыі. Хлопец прызнаецца, што ў нашай краіне яго цікавіць усё без выключэння. Дарэчы, гэты прыезд для чэха не дэбютны, упершыню ў нас ён апынуўся падчас чэмпіянату свету па хакеі, калі чэшскім фанатам пры наяўнасці білета на матч не патрэбна была віза. Падчас гэтай паездкі займеў першых беларускіх сяброў, і другі раз прыязджаў ужо да іх. Трэці раз — на стажыроўку ў БДУ. Адзінае, што засмучае чэха, — у Празе ён не зможа практыкавацца ў мове, бо размаўляць па-беларуску няма з кім.

— Падобная школа правадзілася Беларускім дзяржаўным універсітэтам ў 1990-я гады, — распавядае **метадыст кафедры маладзёжнай палітыкі і сацыякультурных камунікацый Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы Святлана МАКОЎЧЫК.** — І вось праз столькі гадоў мы вырашылі аднавіць гэты праект. Як паказвае практыка, замежнікаў, якія цікавяцца беларускай культурай і гісторыяй, нямала. Сіёры Кіёсава з Японіі нават арганізавала факультатыў па беларускай мове ў сябе на факультэце, Адам Фалбер прыязджае ў краіну не першы раз... Некаторыя пачаткоўцы кааперуюцца з сябрамі, якія ўжо нешта ведаюць пра Беларусь. Геаграфія даволі шырокая: Венгрыя, Германія, Польшча, Расія, Славакія, Чэхія, Японія — усяго 24 чалавекі. І гэта далёка не ўсе, хто сёлета хацеў да нас трапіць.

— У Маскве ў мяне былі сябры-беларусы, таму я ведала мову «пасіўна»: размаўляла з імі, чытала беларускія кнігі, — кажа **Варвара ПОВАРАВА з філалагічнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта.** — Я добра ведаю ўкраінскую, таму вывучаць беларускую мне было лёгка. Праз наша студэнцкае таварыства даведалася, што можна паехаць у Беларусь, папрактыкавацца, і вырашыла не прапускаць такі шанц. Летась прыязджала ў Мінск на фестываль моў, але толькі на два дні. Гэтага часу мала, каб грунтоўна пазнаёміцца з краінай. А вось за час школы ўжо тройчы схадзіла ў Купалаўскі тэатр, я яго вельмі люблю. Глядзела «Пінскую шляхту», «Людзей на балоце» і, зразумела, «Паўлінку». З мерапрыемстваў найбольш запомнілася наведванне музея Якуба Коласа ў Мікалаеўшчыне. Там быў выдатны гід, вясковы дзед, які добра ведае дэталі біяграфіі класіка, але можа расказаць і пра сялянскі побыт. У яго руках усе хатнія прылады ажываюць, і ты сапраўды быццам падарожнічаеш у часе. Увогуле, у гэтым месцы пануе неверагодны спакой, я там адчуваю сябе вельмі ўтульна. Праўда, з Коласа пакуль нічога не чытала, але паездка мяне натхніла — абавязкова ліквідую прабел. Мінск мне таксама спадабаўся, пасля Масквы я тут адпачываю душой і, шчыра кажучы, зусім не хачу вяртацца.

...Тым часам надыходзіць сярэдзіна дня. Паміж практычнымі і лекцыйнымі заняткамі студэнтаў чакае кава-паўза. У вялікім пакоі накрываюць на стол: пячэнне, кубкі з гарбатай і кавай. Займаюцца гэтым беларускія валанцёры.

«Аднойчы навучэнцы школы разам з валанцёрамі паехалі на Камароўку, набылі бульбу і ў «палявых» умовах аўдыторыі гатавалі дранікі. Так бы мовіць, знаёміліся бліжэй з беларускай кухняй!»

— У маі мы з сяброўкай былі на VI Міжнародным кангрэсе беларусістаў, — успамінае **студэнтка IV курса спецыяльнасці «славянская (польская і беларуская) філалогія» філалагічнага факультэта БДУ Аліна АГРЭНІЧ,** — дзе трапілі на секцыю «Беларуская мова як замежная». Прыйшлі туды з тым, каб падтрымаць нашу добрую сяброўку Сіёры Кіёсава. Там жа даведаліся аб правядзенні летняй школы беларусістыкі. Вядома, захацелася туды патрапіць. Ужо пазней выкладчыца Анжаліка Садоўская прапанавала нам узяць у ёй удзел у якасці валанцёраў, і мы без ваганняў пагадзіліся. Атрымалі незабыўныя ўражанні. Сюды прыехалі вельмі добразычлівыя людзі з адкрытымі сэрцамі. І мы шчаслівыя, што ім тут падабаецца. Нам радасна, што навучэнцы наладзілі сувязі паміж сабой, хочацца верыць, што яны застануцца сябрамі і пасля заканчэння школы.

Беларускія валанцёры заўсёды ў гуморы.

Дзяўчаты-валанцёркі са смехам кажуць, што дзеля пачатковага кантакту са многімі студэнтамі ім прыйшлося «падцягнуць» англійскую мову, і ўзгадваюць найбольш запамінальныя выпадкі. Сярод іх своеасаблівая міжнацыянальная імправізацыя: аднойчы навучэнцы школы разам з валанцёрамі паехалі на Камароўку, набылі бульбу і ў «палявых» умовах аўдыторыі гатавалі дранікі. Так бы мовіць, знаёміліся бліжэй з беларускай кухняй!

Даніла РУДЗЯНОК — таксама **студэнт філфака МДУ.** Хлопец вывучае еўрапейскія мовы, у тым ліку славянскія. У яго скарбонцы ўжо ёсць нямецкая, польская, літоўская, латышская, украінская, італьянская, а цяпер надышла чарга беларускай. Інфармацыю пра школу беларусістыкі ён убачыў у сацыяльнай сетцы.

— Беларуская мова адметная, як, у прынцыпе, і любая іншая, — кажа хлопец. — Ад рускай і ўкраінскай яе яскрава адрознівае фанетыка. Увогуле, я назваў бы яе ў добрым сэнсе архаічнай, бо яна захавала шмат таго, што іншыя ўсходнеславянскія мовы страцілі. Калі казаць увогуле пра гэты час, то мне найбольш запомніліся нашы пешыя экскурсіі па Мінску і паездка ў Нясвіж. Але цяжка нешта вылучыць, так шмат цікавага і карыснага было!

Сур'ёзныя размовы пра беларускую літаратуру.

Арганізатары абяцаюць, што сёлетняя летняя школа беларусістыкі не стане апошняй. Таму ўжо сёння шукаюць фінансавую падтрымку ў прыватных кампаній, каб налета зноў запрасіць у Мінск аматараў беларушчыны.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

ЯК МІЦКЕВІЧ «ПАСЯБРАВАЎ» З СЫСАМ

СПАДЧЫНА З АРНАМЕНТАМ

Навучэнка V курса Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа швейнай вытворчасці Вераніка КЛЮЕВА летась выпусціла ўласную калекцыю адзення. Называецца яна «Віленскі шлях». Сукенкі, сарафаны, блузы, сумкі і галаўныя ўборы аздоблены арнаментам. Рэалізоўваўся праект праз конкурс «100 ідэй для Беларусі».

Усё юнацтва Вераніка займалася тэатрам, спевамі і танцамі, а ў школе была выдатніцай. Але пасля выпускнога вырашыла неяк змяніць сваё жыццё і не пайшла па звыклым шляху атрымання вышэйшай адукацыі. Ледзь не выпадкова трапіла ў каледж швейнай вытворчасці. Першы час нават шкадавала, бо прафесія не з лёгкіх, але паступова прызвычаілася і дзякуючы выкладчыкам палюбіла сваю працу.

— У нас ёсць такая дысцыпліна, як «Гісторыя касцюма», дзе мы вывучаем традыцыі адзення ва ўсіх краінах, — узгадвае Вераніка. — Калі дайшлі да Беларусі, мяне, што называецца, «зачапілі» нашы народныя строі. Захацелася зрабіць нешта сваё на іх аснове, тым больш што ў нас многія не цэняць аўтэнтычнасці і непаўторнасці адзення продкаў. Напрыклад, мала хто ведае, што азначаюць розныя элементы арнаменту, а гэта ж як сапраўдная кніга! Ды і ўвогуле, я лічу, што гісторыя і культура нашай краіны вартыя вялікай павагі. Так і нарадзілася задума зрабіць сваю лінію адзення.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Вераніка пачала працу з вывучэння строю, распаўсюджанага ў беларускім Паазер'і — славутым краі, пра які пісаў яшчэ Ян Баршчэўскі. Матэрыялам для калекцыі стаў нябелены лён, амаль такі самы, якім карысталіся нашы продкі. Складаная вышыўка рабілася як уручную, так і пры дапамозе філейнай сеткі. На выхадзе — пяць камплектаў жаночага адзення з беларускімі матывамі.

— Праект праходзіў сетку адбору «100 ідэй для Беларусі» больш за год, — кажа аўтар. — Галоўным дасягненнем лічу тое, што яго на аглядзе адзначыў старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч. Ён прапанаваў запусціць калекцыю ў вытворчасць. Зразумела, не ў якасці паўсядзённага адзення, а як уніформу для супрацоўнікаў аграсядзіб. Я ўжо падрыхтавала бізнес-план, можа быць, у хуткім часе ў сукенках з маёй калекцыі будуць сустракаць турыстаў.

Дарэчы, з будучай прафесіяй Вераніка вызначылася дакладна — яна будзе падбіраць людзям гардэроб ва ўласным атэлье. Пакуль жа дзяўчына трэніруецца і цалкам апранае сама сябе.

Вераніка Клюева і мадэлі калекцыі «Віленскі шлях».

ПАШТОЎКІ РОБЯЦЬ ТАЛАКОЮ!

Дызайнер Настасся ДЫРО здаўна захапляла пасткросінгам. Дасылаць паштоўкі ва ўсе канцы свету і атрымліваць іх у адказ — даволі папулярнае ў беларусаў хобі. Праўда, ледзь не кожны айчынны пасткросер скардзіцца на тое, што знайсці сапраўды незвычайную картку ў нас цяжка. Разам з сябрам Яўгенам ЛОЙКАМ дзяўчына вырашыла зрабіць серыю паштовак, якія было б прыемна дасылаць і атрымліваць.

У іх саюзе нарадзілася канцэпцыя праекта «Навуковыя паштоўкі». Настасся і Яўген выпускаюць карткі, прысвечаныя навуковым законам, падзеям і персаналіям. Акрамя непасрэдна самой паштоўкі, атрымальніка чакае сюрпрыз — калі адсканаваць спецыяльны графічны QR-код пры дапамозе смартфона, можна паглядзець мультфільм. Звычайна гэта прыгожая гісторыя, якая ілюструе якую-небудзь навуковую з'яву.

— Мая роля ў праекце выключна мастацкая, — распавядае Настасся. — Я раблю ілюстрацыі і мультфільмы. Яўген жа стварае ідэі для паштовак, а таксама займаецца арганізацыйнымі пытаннямі. Першапачаткова хацелі ўвогуле скласці цэлы каляндар навуковых свят, бо людзі пра іх мала ведаюць. Вырашылі зрабіць пробную партыю паштовак, прысвечаных Дню гравітацыі, які святкуецца ў дзень нараджэння Ісаака Ньютана — 25 снежня. Гатовы варыянт даслалі сябрам. Ім спадабалася, мы вырашылі працягваць.

Пасля гэтага былі карткі да Дня эвалюцыі, пра беларускага навукоўца Якуба Наркевіча-Ёдку і нават да 14 лютага — з фотаздымкам Зямлі, зробленым з касмічнага апарата «Вояджар»... Акрамя гэтага, Настасся і Яўген рабілі асобныя тэматычныя паштовыя карткі для Музея гісторыі беларускага кіно, Мінскага планетарыя і да Дня роднай мовы.

— Мы размясцілі свой праект на пляцоўцы Talaka.by яшчэ тады, калі магчымасці збіраць грошы на рэалізацыю сваёй ідэі там не было, — узгадвае Настасся. — У мяне, шчыра кажучы, нестава часу займацца чымсьці, акрамя малявання. Таму шукалі людзей, якія дапамаглі б вырашыць пытанні з друкарняй, з продажам і г.д. — атрымалася.

Цяпер «Навуковыя паштоўкі» працягваюць развівацца. Аўтары плануюць і далей пашыраць кола тэм. Дагэтуль асноўнай навукай, на якую рабіўся ўпор, была фізіка. Цяпер жа закранаюцца і біялагічныя з'явы (адна з апошніх паштовак прысвечана ціхаходкам, або вадзяным мядзведзікам — «моцным і мужным жывёлам», як кажа аўтарка). Ёсць ідэі геаграфічных і іншых картак.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

Тэрыторыя ведаў

СЭНС — ЁСЦЬ!

**Так гучыць дэвіз тых, хто гэтым летам пабываў на Усерасійским маладзёжным адукацыйным форуме «Тэрыторыя сэнсаў».
Больш за шэсць тысяч юнакоў і дзяўчат прайшлі адбор і паехалі па новыя веды ва Уладзімірскую вобласць.**

Кожны тыдзень форум па чарзе збіраў праграмістаў, палітыкаў, журналістаў, кіраўнікоў сацыяльных праектаў, эканамістаў, вучоных і выкладчыкаў грамадскіх навук. Першую змену наведаў Уладзімір Пуцін.

«Чытайце па тры кнігі за тыдзень. За год вы зможаце прачытаць 52 кнігі на розныя тэмы і станеце цікавым суразмоўцам».

Мерапрыемства атрымалася міжнародным. На яго прыехалі не толькі маладыя спецыялісты з суседніх дзяржаў, але і прадстаўнікі, напрыклад, Камбоджы і Індыі. Беларусы таксама наведалі «Тэрыторыю сэнсаў». Дзмітрый Дубовік з Баранавіч пабываў на змене «Маладыя вучоныя і выкладчыкі эканамічных навук»:

— На форуме амаль кожны з лектараў даваў карысныя парады. Першы намеснік старшыні ўрада

Расіі Ігар Шувалаў казаў, што зараз моладзь неахвотна бярэцца за ўласную справу. Але развіццё малага і сярэдняга прыватнага бізнесу вельмі важнае для росквіту дзяржавы. Я лічу, што для Беларусі гэта таксама актуальна.

Яўгенія Бярдзюгіна з Карэліч на змене «Маладыя выкладчыкі журналістыкі, маладыя журналісты» таксама пачула некалькі карысных для сябе парад:

— На нашу змену прыехалі не толькі расійскія журналісты, але і госці з ЗША. Дырэктар глабальнай адукацыі ў Джорджтаўнаўскім універсітэце Сэм Паталікія адкрыў некалькі прафесійных сакрэтаў. Першы — кожны дзень размаўляйце з трыма асобамі, да якіх вы б ніколі не звярнуліся. Паспрабуйце даведацца пра іх жыццё. Так за год вы паразмаўляеце больш як з тысячай чалавек. А за некалькі гадоў атрымаеце каласальныя веды ў псіхалогіі. Другі — развівайце цікаўнасць. Задавайце тры пытанні кожныя 20 хвілін. Трэці — чытайце па тры кнігі за тыдзень. Біяграфіі, каб вы маглі параўнаць сваю прафесійную траекторыю з іншымі. Апавяданні ці паэзію: вы павінны разумець культуру і душу краіны. І трэцюю кнігу — аб прадмеце, які вы зусім не ведаеце. За год вы зможаце прачытаць 52 кнігі на розныя тэмы і станеце цікавым суразмоўцам. Чацвёрты — праводзьце гадзіну-паўтары на дзень, думаючы аб інфармацыі, якую атрымалі. Гэта самая важная частка працы, бо цяпер людзі вельмі часта не могуць засяродзіць на нечым увагу. Пяты — правільна падавайце ідэі. Слухачы могуць іх і не заўважыць, калі не ўбачаць у вас разумнага суразмоўцу, якому можна давяраць. Працуйце над гэтым.

«Тэрыторыя сэнсаў» разлічвае стаць штогадовым адукацыйным форумам для моладзі. У 2016 годзе ён, абноўлены, будзе сустракаць новых маладых спецыялістаў.

Надзея АНІСОВІЧ,
студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.

Добрыя сэрцам

Іх прызванне — дапамагаць іншым

Валанцёрства дапамагае чалавеку падняцца над асабістымі праблемамі і ўбачыць беды і клопаты іншых. Валанцёр добраахвотна аддае свае сілы, час, любоў і дабрыню тым, хто мае патрэбу ў дапамозе. Сёння ў Беларусі тысячы маладых людзей удзельнічаюць у гэтым руху. Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа — адно з грамадскіх аб'яднанняў, якое займаецца валанцёрскімі праектамі. Яно згуртоўвае каля 22 тысяч добраахвотных памочнікаў. Штогод іх колькасць павялічваецца на 500 чалавек. Пераважная большасць валанцёраў — актыўныя маладыя людзі, якія прыходзяць сюды па перакананні.

З 20-гадовай Кацярынай Бязручкай і 17-гадовым Іванам Жолудзевым — валанцёрамі гэтага аб'яднання — мне ўдалося сустрэцца і пагутарыць.

Кацярына: — З валанцёрствам я сутыкнулася ва ўніверсітэце. Спачатку мяне яно не вельмі зацікавіла. Але напрыканцы першага курса я апынулася на выязным семінары, дзе расказвалі пра дзейнасць Чырвонага Крыжа. Пасля гэтага і сама пачала прымаць удзел у акцыях таварыства.

Зараз з'яўляюся старшынёй валанцёрскага савета Першамайскага раёна сталіцы. У мае абавязкі ўваходзіць навучанне новых валанцёраў, арганізацыя акцый. А ўвогуле ў таварыстве Чырвонага Крыжа існуе некалькі напрамкаў валанцёрскай дзейнасці. Мне, напрыклад, больш па душы псіхасацыяльная падтрымка людзей. Восенню ў нас праходзіць акцыя «Клопат». Мы арганізоўваем збор прадуктаў для адзінокіх, пажылых і інвалідаў. Таксама мы ездзім у РНПЦ пульманалогіі і фтызіятрыі да дзетак, хворых на туберкулёз.

Ёсць атрад сясцёр міласэрнасці. Шчыра кажучы, сёння ён знаходзіцца на мяжы знікнення. Працуюць там толькі пажылыя жанчыны, яны наведваюць ляжачых хворых, інвалідаў, аказваюць ім дапамогу. Гэта рабіць няпроста, таму, на жаль, ніхто з маладых туды не ідзе.

Акрамя таго, існуе атрад хуткага рэагавання Чырвонага Крыжа. Напрыклад, зімой машына можа засесці ў снезе, тады атрад выязджае і робіць усё, каб яе вызваліць.

Іван: — У атрада ёсць свая радыёхваля, агульная з МНС. У Мінску ён аб'ядноўвае 50 чалавек. І калі яны даведваюцца, што нешта здарылася, выязджаюць, збіраюць каманду, стараюцца дапамагчы.

Кацярына: — Аднойчы мы паехалі да дзяцей-інвалідаў і пасля ўсіх мерапрыемстваў проста сядзелі і размаўлялі з імі. Здавалася б, хлопчыкі і дзяўчаткі, абмежаваныя ў магчымасцях, з няпростымі лёсамі, але якую вялікую прагу да жыцця яны маюць, якія глабальныя планы строяць! Адзін хлопец казаў, што хоча стаць юрыстам, і відаць, як ён зараз стараецца вучыцца, каб здзейсніць сваю мару. Пасля паездак у РНПЦ пульманалогіі і фтызіятрыі дзеці звычайна знаходзяць нас у інтэрнэце і дзякуюць за тое, што зрабілі ім свята. Гэта насамрэч для нас вельмі дорага.

Іван: — Дзяцей успрымаеш як родных, блізкіх табе людзей. Заўсёды атрымліваеш задавальненне ад таго, што хоць крышачку дапамог тым, хто ў тваёй дапамозе мае патрэбу.

Спачатку было вельмі цяжка, ды і цяпер нялёгка: увесь час на нагах, даводзіцца сумяшчаць працу з вучобай... Асабліва цяжка ў псіхалагічным плане. Людзі, якім ты спрабуеш дапамагчы, бываюць розныя: могуць накрычаць на цябе, груба размаўляць або ўвесь час плакаць, могуць увогуле не адказваць на твае пытанні.

Кацярына: — У час тэлефоннай псіхасацыяльнай падтрымкі хворых на туберкулёз, няпроста было знаходзіць патрэбныя словы, каб супакоіць чалавека.

Іван: — Мне здаецца, галоўныя рысы валанцёра — гэта працавітасць і ўпэўненасць ва ўласных сілах. Сітуацыі бываюць розныя, і ты павінен цвёрда ведаць, што будзеш працаваць, зможаш праз усё прайсці, бо галоўнае — дапамагчы людзям.

Лізавета КАРПОВІЧ,
студэнтка I курса эканамічнага факультэта БДУ.

Важацкі хлеб

ЗРАЗУМЕЦЬ У ЛАГЕРЫ ГАЛОЎНАЕ

Вольга Главацкая вучыцца ў Баранавіцкім дзяржаўным універсітэце на настаўніцу малодшых класаў. Гэтае лета выдалася для яе асаблівым, бо дзяўчына яшчэ на крок наблізілася да сваёй будучай прафесіі: у ліпені-жніўні праходзіла практыку ў дзіцячым лагеры ў якасці важатай.

— Гэта было на базе адпачынку «Гаць», што знаходзіцца ў Баранавіцкім раёне, у лагеры «Зорачка». Спачатку мяне накіравалі ў трэці атрад да дзяцей ад 11 да 12 гадоў. Але праз кароткі прамежак часу сказалі, што я буду важатай першага атрада — у 22 падлеткаў ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў. Спачатку вельмі спалохалася, бо не ведала, як буду спраўляцца з тымі, хто малодшы за мяне ўсяго на чатыры-пяць гадоў. Але хутка зразумела, што са старэйшымі куды лягчэй. Яны больш адказныя і дапамагаюць, калі трэба. Праўда, і з імі былі некаторыя праблемы, бывала, што выхаванцы не слухаліся.

«Мне з падапечнымі было вельмі лёгка і весела. І ім было цікава са мной. Некаторыя нават дадому ехаць не хацелі».

— Як праходзіў дзень?

— Раніца пачыналася з зарадкі, потым лінейка, сняданак, прыборка тэрыторыі, асабісты час, абед, ціхі час, полудзень, заняткі ў гуртках, вячэра, дыскатэка, сон. На маёй адказнасці быў догляд дзяцей, дапамога ў падрыхтоўцы мерапрыемстваў. Аднойчы давялося самой праводзіць флэш-моб: увесь наш атрад танцаваў. Тады мы занялі другое месца.

— А як складваліся адносіны з дзецьмі?

— Многія з іх ужо былі ў летніку не першы раз. Яны хутка знаходзілі агульную мову паміж сабой. У нас нават з часам з'явіліся дзве пары закаханых! Мне з падапечнымі было вельмі лёгка і весела. І ім было цікава са мной. Некаторыя нават дадому ехаць не хацелі.

— Што табе запомнілася найбольш?

— Пасля заканчэння змены на наступны дзень мы з дзецьмі сабраліся ў Баранавічах, купілі два кавуны, фатаграфаваліся. Дарэчы, у нас і цяпер вельмі добрыя адносіны.

— Які «капітал» вынесла з практыкі?

— Калі гаварыць пра матэрыяльнае, зарплата была каля 1,4 мільёна рублёў. Куды патраціла грошы? Штосьці на адзенне, штосьці на нейкія дробязі.

А ўвогуле я вельмі задаволена практыкай. Мне спадабалася працаваць з дзецьмі. А для сябе вынесла, што, мабыць, для мяне было б лепш працаваць настаўніцай беларускай мовы і літаратуры, як я калісьці хацела. Але хто ж ведае, як усё складзецца надалей?

...Здаецца, усяго тры тыдні іншага рэжыму, але колькі эмоцый, колькі адкрыццяў і высноў для сябе можна зрабіць за такі невялікі час!

Таццяна ЛАУШ,
студэнтка III курса факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму ГрДУ ім. Я. Купалы.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	- Капитальное строение, инв. № 400/С-69051 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель) площадью 220,4 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121К/2. - Капитальное строение, инв. № 400/С-69021 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) площадью 243,9 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121К/1. - Капитальное строение, инв. № 400/С-69106 (назначение – здание многофункциональное) площадью 1209,3 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121К. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97342 (назначение – сооружение неустановленного назначения) площадью 2070,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания зданий столярной мастерской, блока складов и механического цеха, склада КиПа. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97348 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства) протяженностью 68,6 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию блока складов и механического цеха. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97337 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства) протяженностью 81,3 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная ливневая канализационная сеть к блоку складов. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97332 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства) протяженностью 104,5 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к блоку складов и механическому цеху. - Капитальное строение инв. № 400/С-97387 (назначение – сооружение специализированное энергетики) протяженностью 228,7 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ от РП-10кВ до ТП-3 до ТП-4. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97379 (назначение – сооружение специализированное энергетики) протяженностью 61,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к блоку складов и механическому цеху. - Капитальное строение, инв. № 400/С-85886 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства) протяженностью 343,9 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; - шкаф распределительный ПР-24-7208; - трансформаторная подстанция 2 РТ 1000/10 № 1; - распределительный пункт ПР-24-11-7205; - трансформатор масляный силовой ДУ-ТМЗ-1000/10 ТП-2; - трансформатор масляный силовой ДУ-ТМЗ-1000/10 ТП-2; - распределительный пункт ПР-24-7210-54УЗ; - теплосчетчик ТЭМ 05м, ДУ=80; - теплосчетчик ТС-07ХХ-88 «Струмень»; - туя (1 единица)
Земельный участок, на котором расположен объект	- кадастровый номер 440100000002008242, площадь 0,9480 га (назначение – для обслуживания зданий столярной мастерской (инвентарный номер 400/С-69051), блока складов и механического цеха (инвентарный номер 400/С-69106), склада КиПа (инвентарный номер 400/С-69021)) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121 К; - кадастровый номер 440100000002006868, площадь 0,0007 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006869, площадь 0,0007 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006871, площадь 0,0003 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006872, площадь 0,0002 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006873, площадь 0,0002 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006874, площадь 0,0003 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006875, площадь 0,0037 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006876, площадь 0,0002 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006877, площадь 0,0003 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006878, площадь 0,0003 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006879, площадь 0,0312 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети), расположенные по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121
Начальная цена продажи	5 499 292 933 (пять миллиардов четыреста девяносто девять тысяч двести девяносто две тысячи девятьсот тридцать три) белорусских рубля без учета НДС
Сумма задатка	274 964 647 (двести семьдесят четыре миллиона девятьсот шестьдесят четыре тысячи шестьсот сорок семь) белорусских рублей
Условия аукциона	Без условий
ЛОТ 2	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	- Капитальное строение, инв. № 400/С-89984 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – ангар) площадью 449,7 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Ж. - Капитальное строение, инв. № 400/С-69050 (назначение – здание специализированное трубопроводного транспорта, наименование – насосная станция) площадью 187,6 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Ж/1. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97340 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории) площадью 105,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания здания автоматической насосной станции, резервуара для воды и здания ангара. - Капитальное строение, инв. № 400/С-58952 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – резервуар для воды на 500 куб.м) объемом 500 куб.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97349 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация) протяженностью 43,20 м, г. Гродно ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию насосной станции. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97339 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная ливневая канализация) протяженностью 43,85 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная ливневая сеть к резервуару для воды. - Капитальное строение инв. № 400/С-97334 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод) протяженностью 24,45 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121 внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к зданию автоматической насосной станции. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97386 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная сеть наружного освещения) протяженностью 267,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121 внутриплощадочная сеть наружного освещения здания автоматической насосной станции, резервуара для воды и здания ангара. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97378 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ) протяженностью 119,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к зданию автоматической насосной станции. - тополь (2 единицы); - каштан (14 единиц)
Земельный участок, на котором расположен объект	кадастровый номер 440100000002008244, площадь 0,4859 га (назначение – для обслуживания здания автоматической насосной станции (инв. № 400/С-69050), резервуара для воды на 500 куб.м (инв. № 4660) и здания ангара (инв. № 400/С-89984)) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Ж
Начальная цена продажи	2 220 511 658 (два миллиарда двести двадцать миллионов пятьсот одиннадцать тысяч шестьсот пятьдесят восемь) белорусских рублей без учета НДС
Сумма задатка	111 025 583 (сто одиннадцать миллионов двадцать пять тысяч пятьсот восемьдесят три) белорусских рублей
Условия аукциона	Без условий
ЛОТ 3	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	- Капитальное строение, инв. № 400/С-63419 (назначение – здание нежилое, наименование – здание установки контактного выпаривания) площадью 662,4 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Д. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97341 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории) площадью 165,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания здания установки контактного выпаривания, резервуара. - Капитальное строение, инв. № 400/С-58964 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – резервуар на 250 куб.м пожарно-аварийный водоем), объемом 250 куб.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97347 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация) протяженностью 365,10 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию установки контактного выпаривания. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97335 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод) протяженностью 22,15 м, г. Гродно ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к зданию установки контактного выпаривания. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97385 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная сеть наружного освещения) протяженностью 103,70 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная сеть наружного освещения здания установки контактного выпаривания, резервуара. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97382 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ) протяженностью 117,70 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к зданию установки кинтактного выпаривания. - шкаф распределительный ПР-24-7208. - липа (4 единицы); - тополь (2 единицы)
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 440100000002008243, площадь 0,2356 га (назначение – для обслуживания здания установки контактного выпаривания (инв. № 400/С-63419), резервуара на 250 куб.м ПАВ (инв. № 4702)) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121 Д
Начальная цена продажи	2 035 700 898 (два миллиарда тридцать пять миллионов семьсот тысяч восемьсот девяносто восемь) белорусских рублей без учета НДС
Сумма задатка	101 785 045 (сто один миллион семьсот восемьдесят пять тысяч сорок пять) белорусских рублей
Условия аукциона	Без условий
ЛОТ 4	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	- Капитальное строение, инв. № 400/С-69029 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – блок предочистки) площадью 320,4 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Е; - Капитальное строение, инв. № 400/С-97343 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории) площадью 390,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания здания блока предочистки. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97350 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация) протяженностью 12,50 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию блока предочистки; - Капитальное строение, инв. № 400/С-97331 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод) протяженностью 190,40 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к зданию предочистки; - Капитальное строение, инв. № 400/С-97381 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 80,80 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть к зданию блока предочистки; - липа (12 единиц); - шкаф распределительный; - дерен белый (1 единица)
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 440100000002008245, площадь 0,2180 га (назначение – для обслуживания здания блока предочистки (инв. № 400/С-69029)) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121 Е
Начальная цена продажи	2 584 018 278 (два миллиарда пятьсот восемьдесят четыре миллиона восемнадцать тысяч двести семьдесят восемь) белорусских рублей без учета НДС
Сумма задатка	142 700 914 (сто сорок два миллиона семьсот тысяч девятьсот четырнадцать) белорусских рублей
Условия аукциона	Без условий

Наименование	Характеристика
ЛОТ 5	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	- Капитальное строение, инв. № 400/С-17193 (назначение – здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий, наименование – главный производственный корпус) площадью 29971,7 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г, состоящее из капитальное строение инв. № 400/D-152212 (назначение – производственное помещение, наименование – главный производственный корпус) площадью 29418,5 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г-2 и капитальное строение инв. № 400/D-123114 (назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – помещение неустановленного назначения) площадью 523,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г-1. - Капитальное строение инв. № 400/С-69015 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – автоматическая насосная станция пожаротушения) площадью 160,5 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г/2; - Капитальное строение, инв. № 400/С-69014 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – КПП-120) площадью 19,6 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г/1. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97344 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории) площадью 7950,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания зданий и сооружений главного производственного корпуса. - Капитальное строение, инв. № 400/С-86338 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – резервуар для хранения 8% раствора пенообразователя) объемом 250,0 куб.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-58965 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – резервуар на 1000 куб.м) объемом 1000 куб.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-89988 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – площадка под емкости), площадью застройки 119,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-85888 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть) протяженностью 586,05 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97346 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация) протяженностью 325,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию главного производственного корпуса. - Капитальное строение, инв. № 400/С-89982 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внеплощадочная ливневая канализация) протяженностью 1940,20 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97338 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная ливневая канализация) протяженностью 1189,75 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная ливневая сеть к зданиям и сооружениям главного производственного корпуса. - Капитальное строение, инв. № 400/С-89983 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внеплощадочная напорная канализация) протяженностью 243,80 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-86070 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная тепловая сеть) протяженностью 729,35 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-62631 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – паропровод) протяженностью 457,95 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-55845 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внеплощадочная кабельная линия, напряжением 10 кВ) протяженностью 1018 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-74384 (назначение – сооружение специализированное связи, наименование – внутриплощадочная телефонная канализация) протяженностью 193,20 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97333 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод) протяженностью 582,90 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к зданиям и сооружениям главного производственного корпуса. - Капитальное строение, инв. № 400/С-74876 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный пожарный водопровод) протяженностью 227,80 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-74877 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный пожарный водопровод) протяженностью 991,36 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97384 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная сеть наружного освещения) протяженностью 420,40 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, внутриплощадочная сеть наружного освещения зданий и сооружений главного производственного корпуса. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97380 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ) протяженностью 353,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к зданиям и сооружениям главного производственного корпуса. - Капитальное строение, инв. № 400/С-97392 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ) протяженностью 473,70 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ от РП-10 кВ до ТП-1, от ТП-1 до ТП-2. - Капитальное строение, инв. № 400/С-55838 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная напорная канализация) протяженностью 277,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-55842 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный производственный водопровод) протяженностью 1305,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-85887 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – мостовое сооружение) протяженностью 48,00 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ марки ААБл3*95, протяженностью 155 м. - Внутриплощадочная кабельная линия 0,4 кВ марки АВБбШв протяженностью 70 м. - пункт распределительный (50 единиц); - камера КСО-272 (2 единицы); - трансформаторная подстанция 2 КТП 1000/10 ТП-4; - камера КСО – 3 комплекта; - панель ЩО-7024; - шкаф вводно-распределительный ВРУ-1; - трансформатор масляный ТМЗ-1000/10 Т-4 (2 единицы); - трансформатор масляный силовой ДУ-ТМЗ-1000/10 ТП-2 (4 единицы); - трансформаторная подстанция 2 КТП 1000/10,3 (2 единицы); - трансформаторные ячейки КРУ-821-00848 (2 единицы); - шкаф S-9522-13; - вентилятор центробежный с эд/двиг. (7 единицы); - камера орошения КТЦ-2-63; - бак сбора выпарки 10 мкуб.; - камера орошения КТУ-2-40 (7 единиц); - кондиционер (6 единиц); - бак сбора конденсата 10 мкуб. (2 единицы); - пресс для угаров АРО-1 (2 единицы); - смесовая машина; - красильный аппарат типа «Линдер»; - набивная машина НВ-150; - центрифуга ФМК-1521-К1; - механизированный лабаз ЛРМ-40М-1; - кисловочная машина с отжимными валами; - аппарат красильный АКДУ-601 с поддонами 2 (единицы); - разрыхлительно-трепальный агрегат АРТ-120Ш; - механизированный лабаз ЛРМ-40М-1 (2 единицы); - бункер пылеулавливающий 3730*2800*2310 (8 единиц); - агрегат для сушки волокна АСВ-120-Ш; - красильно-промывная машина МКП-Ш-1; - таль электрическая г/п 1т (2 единицы); - дизель-генератор ДГА-3-48; - туя (4 единицы); - липа (4 единицы); - бак-мешалка объемом 0,63 куб.м; - бак-мешалка, объемом 1,6 куб.м; - сборник стальной эмалированный 2,0 куб.м; - станина и барабан спирально-бильного волчка; - настил пола стальной с просечкой 25 кв.м; - двутавр стальной горячекатаный № 26 (47 м); - двутавр стальной горячекатаный № 10 (15 м); - двутавр стальной горячекатаный № 18 (27 м); - швеллер стальной горячекатаный № 18 (44 м); - уголок стальной горячекатаный № 50 (20 м).
Земельный участок, на котором расположен объект	- кадастровый номер 440100000002000562, площадь 4,8205 га (назначение – обслуживание зданий и сооружений главного производственного корпуса) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г; - кадастровый номер 440100000002006864, площадь 0,0078 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста); кадастровый номер 440100000002006865, площадь 0,0016 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста); кадастровый номер 440100000002006866, площадь 0,0014 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста); кадастровый номер 440100000002006867, площадь 0,0073 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121
Начальная цена продажи	88 472 233 714 (восемьдесят восемь миллиардов четыреста семьдесят два миллиона двести тридцать три тысячи семьсот четырнадцать) белорусских рублей без учета НДС
Сумма задатка	4 423 611 686 (четыре миллиарда четыреста двадцать три миллиона шестьсот одиннадцать тысяч шестьсот восемьдесят шесть) белорусских рублей
Условия аукциона	Без условий
Продавец	РУПП «Гроднотекстиль», 230015, г. Гродно, ул. Горького, 121 тел./факс 43-99-64
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225.

Аукцион состоится 23 сентября 2015 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 24.07.2015 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:
г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)

Последний день приема заявлений – 17 сентября 2015 г. до 15.00

Телефон для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Сямейны тэатр

З БАЦЬКАМІ І БЕЗ ІХ

Запрашае абноўлены ТЮГ

Тэатр юнага гледача пасля доўгай рэканструкцыі пачне сталa працаваць на абноўленай сцэне: ужо 12 верасня прыляціць «Сіняя птушка» Марыса Метэрлінка. А далей пойдзе не зусім звычайная праца па пастаноўцы спектакляў, таму што ёсць звышзадача: вяртанне свайго гледача, бо за пяць гадоў рэканструкцыі, калі ТЮГ працаваў на іншай пляцоўцы, з'явілася цэлае пакаленне дзяцей, якое не ведае, дзе знаходзіцца такі тэатр. А варта было б.

Будынак тэатра юнага гледача.

Мастацкі кіраўнік тэатра Уладзімір САВІЦКІ лічыць:

— Першаасноваа рэпертуарнага тэатра — добрая літаратура. Калі гаворка ідзе пра наш тэатр, то аснова — школьная праграма па беларускай і рускай літаратуры. Хацеў бы, каб больш было твораў нашых нацыянальных аўтараў. Калі не хопіць сучасных аўтараў, то возьмем класіку. Добры матэрыял дае магчымасць выхоўваць дзяцей на нашых спектаклях і нам як тэатру расці прафесійна.

У тэатра цяпер вялікі штат — усяго 217 супрацоўнікаў, з іх 45 — акцёраў. Трупа вялікая, за гады працы на іншых пляцоўках, калі ставіліся ў асноўным малыя спектаклі, усе засумавалі па цікавай рабоце. Асноўная задача цяпер — рэпертуар, каб прафесійны драматычны тэатр быў цікавы як маленькім дзецям, так і іх бацькам, падлеткам і моладзі. Каб гэта быў сапраўды сямейны тэатр.

Сваю афішу тэатр збіраецца запоўніць творамі сучасных беларускіх аўтараў, ад малых спектакляў перайсці да маштабных і шматпланавых, даць магчымасць ставіць маладым рэжысёрам, якія ў сваіх эксперыментах і памкненнях найбольш адчуваюць гэтую аўдыторыю. Адной з такіх пастановак павінна стаць «Дзікае паляванне караля Стаха» паводле Караткевіча.

Дэкарацыі са спектакля «Сіняя птушка».

— Наш глядач сёння мае багата крыніц інфармацыі, ён вельмі шмат бачыць, хутка думае. Таму мы павінны строіць сваю працу, зыходзячы з узроставых патрэб гледача, — тлумачыць **дырэктар тэатра Ігар ВАРОНІН.** — Будзем выкарыстоўваць розныя спосабы, каб прывабіць яго: канцэрты ў антракце, інтэрактыўныя конкурсы, прывабныя афішы і праграмкі. Будзем прыцягваць больш маладых акцёраў і рэжысёраў, якія былі б зразумелыя маладой аўдыторыі. Збіраемся рабіць адмысловыя праекты. Адзін з іх — «4 сезоны ў ТЮГу» — накіраваны на тое, каб прыцягнуць у тэатр навучэнцаў прафесійна-тэхнічных устаноў. Пакуль гэтая аўдыторыя не асабліва схільная наведваць тэатр.

Але ж, можа быць, сапраўды, справа ў тым, як тэатр гаворыць з гледачом? Гэта і магчымасці сцэны — пасля рэканструкцыі можна ажыццявіць даволі смелыя задумы. І рэжысёрскія прыёмы, і выбар матэрыялу: пра што гаварыць з дзеткамі і моладдзю. І нават — на якой мове. У Тэатра юнага гледача ў прыярытэце — беларуская.

— Тэатр задумваўся і ствараўся як нацыянальны тэатр для дзяцей, — адзначыў Уладзімір Савіцкі. — Калі на сцэне адбываецца нешта цікавае, то дзеці разумеюць гэта на любой мове. Тэатраў, якія працуюць і прапануюць спектаклі па-руску (у тым ліку дзіцячы рэпертуар), у нас шмат.

— Могуць быць знойдзены розныя сродкі паразумення з беларускай мовай, — удакладняе **загадчыца літаратурнай часткі Жанна ЛАШКЕВІЧ.** — Мы, напрыклад, знайшлі такі спосаб: складалі слоўнічак спектакля, выбіралі самыя незразумелыя, можа быць, састарэлыя словы. Высветлілася, што гэта ўспрымаецца нармальна, і калі да бацькоў траплялі такія слоўнічкі, у зале чулася: «О, дык мой дзед так кажа!» Калі ставілі «Брык і Шуся шукаюць лета» Таццяны Сівец, нам прыйшоў водгук: сын згадаў, што дзядуля ўжывае два словы «брыкнуць» і «шуснуць». Самыя неўжывальныя словы ці старажытныя мы «запакоўваем» у такі кантэкст, што яны не могуць быць незразумелымі. А бацькі і педагогі часам кажуць дзецям: слухай, як гэта вымаўляецца, слухай, як ужываецца.

У тэатры сёння рады супрацоўніцтву з беларускімі сучаснымі драматургамі і пісьменнікамі, якія дасылаюць свае прапановы — і вельмі цікавыя творы. Будзе што паглядзець?!

Ларыса ЦІМОШЫК.
tsimoshyk@zviazda.by

Мовай плаката

УСЕ ФАРБЫ ЖЫЦЦЯ — ПРАЗ ПРЫЗМУ БЕЛАГА І ЧОРНАГА,

або Два колеры дзёрзкай маладосці

«Преподаватель Найден». Такі подпіс можна пабачыць пад імёнамі студэнтаў-дызайнераў, калі апошнія здаюць на праверку свае працы. Зрэшты, на занятках у Рамана Найдзена — выкладчыка Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў — можна знайсці не толькі яго самога, але і новыя магчымасці светабачання. Нядаўна ў Музеі сучаснага мастацтва прайшла выстава студэнцкіх работ, у якіх першакурснікі асэнсоўвалі вечныя пытанні з дапамогай аркушаў белай і чорнай паперы. Экспазіцыя, прысвечаная 100-годдзю УНОВІСа («Сцвярджальнікі новага мастацтва»), створанага ў Віцебску Казімірам Малевічам авангарднага мастацкага аб'яднання, вымушала да разваг. І аўтараў, і наведвальнікаў.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Мы вырашылі сустрэцца з тым самым выкладчыкам, што прымушае студэнтаў думаць і сам выдумляе праекты кшталту «Белае Чорнае. Black White».

— Скажыце, як ідэі «Сцвярджальнікаў новага мастацтва» і работы сучасных студэнтаў з кафедры графічнага дызайну змаглі аб'яднацца ў адзін праект?

— УНОВІС быў даволі бунтарскім праектам, і сёння, калі адсутнічае дыстанцыя паміж выкладчыкам і аўдыторыяй, сумесны занятак таксама ператвараецца ў арт-працэс. Студэнт захапляецца, і язык не паварочваецца называць яго работы «вучэбнымі». Гэта закончаны твор, які з поўным правам можа выйсці за сцены навучальнай установы.

— Праект анансаваны як штогадовы. Гэта азначае, што плануюцца яшчэ выставы?

— Увогуле гісторыя з праектам даволі дзіўная. У 2008 годзе ў вучэбным раскладзе на першым курсе з'явіўся новы прадмет «Плакат». Я лічу гэтую дысцыпліну складанай і для першага курса непрыдатнай, бо трэба асвоіць камп'ютар, фатаграфію, шрыфт, экспазіцыю, колеразнаўства, іншымі словамі, усё тое, чым першакурснікі валодаць ніяк не маглі. І вось тут прыйшла ідэя дадаць у занятак элемент гульні: на прыёме кантрасту паміж чорным і белым візуалізаваць нейкую думку. Студэнты атрымалі заданне і два аркушы паперы, хоць я сам яшчэ не ведаў, ці атрымаецца з гэтай задумы штонебудзь. І здзівіўся, калі першакурснікам такая праца спадабалася, яны пачалі прапаноўваць ідэі, спрачацца і аналізаваць. Гэта было цікава, бо нават адарваўшы кавалак аркуша, можна было стварыць нейкі вобраз. У выніку шэсць гадоў мы эксперыментавалі. Сабралася цэлая калекцыя — 54 работы, і я адчуў, што гэта гатовы праект, які можна паказаць. На экзаменацыйных праглядах работы бачаць толькі выкладчыкі, а праз выставу яны «выйшлі» да іншых гледачоў.



«Меркаванняў шмат, а ісціна адна». Аўтар Марыя Кірыльчык.

Першай выставай была «Белае Чорнае» — работы першакурснікаў перыяду 2008—2015 гадоў. Другі курс працаваў у гэты час над «Шрыфтавым плакатам», трэці — проста над «Плакатам». Чацвёрты займаўся такімі цікавымі праектамі, як «Яйка» і «Арт-упакоўка». Студэнты ператварылі яйка памерам 50х70 міліметраў са шкла, дрэва, пластмасы ў твор мастацтва і прыдумлялі ўпакоўку, па знешнім выглядзе якой можна здагадацца, які прадмет пакладзены ўсярэдзіну. Пяты курс займаўся «Візітнай карткай». Плануецца, што ўсе гэтыя шэсць праектаў будуць праходзіць па адным на год. Такім чынам, у кожнага пакалення вучняў будзе свая выстава. Апошняя адбудзецца ў 2019 годзе, калі будзе адзначацца 100-гадовы юбілей УНОВІСа. Спадзяюся, усё атрымаецца.

— Калі глядзіш на плакаты, іх хочацца назваць сацыяльнымі. Перадаць праз пэўны вобраз СНІД, адзіноту, вайну, суіцыд — ці не занадта складаная задача для першакурснікаў?

— У многіх работах, сапраўды, відаць сацыяльны кантэкст. Паўтаруся, брацца за плакат трэба на трэцім курсе. Тады, з улікам атрыманых ведаў, ён будзе выкананы па ўсіх правілах. А вось гульня ў «Белае Чорнае» лепш падыходзіць якраз для першага курса, калі студэнт яшчэ малады, нявопытны, дзёрзкі, мае жаданне ствараць нешта новае і пераварочваць асновы. Выказаць праз два колеры рэчы, з якімі мы так ці інакш сутыкаемся, — гэта якраз для іх.

— Вы неяк казалі, што не абмяжоўвалі навучэнцаў у творчасці. Можна было ўзяць сподачак, наліць туды фарбы...

— І мазануць па паперы. Зрэшты, некаторыя так і рабілі.

— І ўсё ж, што больш важна ў малюнку: як яго можна зразумець з першага позірку, ці тое, як гэты малюнак можна патлумачыць, прычым часам толькі з дапамогай дадатковай падказкі?

— Калі мы толькі распачыналі працу, я казаў: «Сябры, прыёмы могуць быць самыя розныя: графіка, шрыфты, аплікацыя, малюнак і нават метад жывапісу. Але дамінантай заўсёды будзе сэнс, дакладней, яго расшыфроўка». Ёсць такія работы, дзе наогул дваістае чытанне, але ж у тым іх і вартасць, калі аўтар пакідае месца для разваг. З ім, аўтарам, можна нават не згаджацца...

— А вы часта не згаджаецеся з прапановамі студэнтаў?

— Імкнуся выступаць на занятках у ролі апанента. Калі не падабаецца нешта ў прапанаванай ідэі, заўсёды тлумачу, чаму яна здалася мне недакладнай альбо некарэктнай. У такіх спрэчках мы вучымся адно ў аднаго. І ў гэтым уся інтрыга і кайф, калі студэнт прыносіць работу і відаць, што з ёй можна зрабіць далей. Вядома, прасцей сказаць у лоб: «Робім так і так», але ж цікава даваць падказкі і назіраць, як вучань сам «выруліць» да новай ідэі.

«Гэта жыццё». Аўтар Настасся Мяснікова.

— Побач, а то і на самім плакаце ёсць подпіс у выглядзе выслоўя або цытаты. Гэта таксама вобразатворны ход? Наогул, ці патрэбны візуальнаму вобразу тлумачальны подпіс?

— Вельмі важны момант, калі да работы ёсць тэкставы каментарый. Многія з іх студэнты бралі з інтэрнэту. Цікавыя фразы станавіліся цудоўнай тэмай для візуалізацыі. Зрэшты, пошукі былі толькі ўступнай часткай, потым пачыналася выяўленчае ўвасабленне слоў у вобраз. Не дзіўна, што некаторыя плакаты, калі не даць ім каментарыя з фразы-першаасновы, ператвараюцца ў рэбус.

— Падзяліцеся назіраннямі: у якіх жыццёвых «фарбах» студэнты бачаць свет вакол сябе?

— Наконт студэнтаў-першакурснікаў можна сказаць, што яны надзвычай сталыя для сваіх гадоў. Яны здатныя разважаць і мысліць, вылучаць сур'ёзныя і глыбокія рэчы, а потым ствараць па-сапраўднаму класныя работы. Успамінаю сябе ў іх узросце і здаецца, што мне тады яшчэ падобныя думкі ў галаву не прыходзілі. Студэнты ўдзельнічаюць у конкурсах, напрацоўваюць вопыт і загадзя плануюць кар'еру. Хоць маладосць усё ж бярэ сваё: яны імклівыя, жадаюць апярэдзваць усё, што павінна рухацца сваім шляхам, у тым ліку і вучэбны працэс.

— Большасць ідзе на дызайн, бо прэстыжна, ці па «голасе сэрца»?

— Часам з першага ж занятку адчуваеш — студэнт «загарэўся». А іншых даводзіцца цягнуць, падбадзёрваць, а то і прымушаць. Аднак лічу, што за пяць гадоў вучобы любоў да прафесіі абавязкова з'явіцца.

Рагнеда ЮРГЕЛЬ,
студэнтка V курса
Інстытута журналістыкі БДУ.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
10 09 2015 г.

SEX=БАЛЯСЫ

Давай, Шэран, «запальвай»!

Гэтыя дзве навіны дайшлі да мяне адначасова. Па традыцыі пачнём з дрэннай. Калі коратка перадаць сутнасць праблемы (вядома, праблемы, а як яшчэ тое назваць!), дык заходнія славутасці, па прагнозах выдання The Verge, хутка зусім перастануць раздзявацца ў кадры. Натуру заменіць камп'ютарная графіка. Жах, праўда?!. Сучасныя тэхналогіі замахваюцца на святое! Гэта ж якія мы будзем глядзець стужкі? Ведаеце анекдот? «Ты самы запамінальны эпізод з фільма «Асноўны інстынкт» памятаеш?» — «А як жа!» — «Во, значыць, гэта ты помніш, а дату нашага вяселля — не?» Хоць маладыя, можа, і не здагадваюцца, пра што гэта я («Выраслі цэлыя пакаленні, якія не ведаюць, навошта намазваць палову яйка зубной пастай»). А некалі ж той эпізод, як і іншыя падобныя, быў — ух! Гэта ж класіка жанру, аснова, можна сказаць, палавога выхавання цэлых пакаленняў! («Два карапузы гуляюць у пясочніцы. «Машка, а давай па-даросламу?» — «Давай!» — «Марыя Рыгораўна!» — «Слухаю, Пётр Сяргеевіч!») Хто ведае, той ведае, дзеля чаго мы некалі хадзілі на фільмы «Маленькая Вера» і «Новыя амазонкі»...

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Чаго ты, маўляў, завёўся, спытае нехта. Адкажу словамі аднаго з герояў фільма «12 крэслаў»: «Дазвольце, таварышы! У мяне ўсе хады запісаны!» Значыць, акцёры жадаюць, каб іх ведалі і любілі мільёны гледачоў, так? Яны хочуць здымацца ў самых лепшых і, што таксама важна, касавых стужках. Чырвоная дарожка, «Оскар» і сэлфі на сцэне — у камплекце. Нічога не прапусціў? А раздзецца цяпер, выходзіць, — ні-ні? Гэта нават калі не згадваць, што прафесія акцёра па азначэнні публічная і ён павінен быць гатовы да ўсяго. У тым ліку і да «таго самага». Першасная задача акцёра (хоць насамрэч у нашым кантэксце мы, зразумела, гаворым найперш пра актрыс) — далучаць гледача да прыгожага, дарыць яму розныя эмоцыі, натхняць на ўчынкі ўрэшце. («Святлана Пятроўна, я вас сёння ноччу сніў!» — «І што?» — «Што вы толькі ні вытваралі, пасаромеліся б, галубка...») Калі ў Леаніда Гайдая праходзіла пробы на ролю ў фільме «Аперацыя «Ы» і іншыя прыгоды Шурыка» Наталля Селязнёва, мэтр савецкай камедыі, вядома ж, з патаемным сэнсам сказаў ёй: «Адыгралі вы нічога сабе, вось толькі фігура...» Селязнёва схамянулася: «А што фігура?» І — раз з сябе сукенку, засталася толькі ў купальніку (дык і час жа быў глыбока савецкі). Падобная сцэна потым увайшла ў фільм.

Шэран Стоун больш чым праз 20 гадоў пасля выхаду фільма ўзяла і знялася для аднаго часопіса цалкам аголенай! Такім і павінен быць «асноўны інстынкт» сапраўднай актрысы і прыгожай жанчыны.

Згаданае вышэй выданне адзначае, што існуюць розныя версіі таго, чаму аголеную натуру ў кадры пачалі «маляваць». Рэжысёры такім чынам абыходзяць пункты ў кантрактах знакамітасцяў наконт аплаты здымак у стылі «ню» («Я лічу, ты не маеш рацыі» — «Пералічы!»), а самі «зоркі» часта ляпаюцца займацца трэніроўкамі, каб потым годна выглядаць у кадры ўсяго некалькі секундаў (дык справа ў фігурах ці ў часе?). Адзін спецыяліст па спецэфектах, які даваў інтэрв'ю, сцвярджае, што галоўная прычына выкарыстання графікі — гэта жаданне зняць па-сапраўднаму добрую сцэну (?!). Маўляў, нават самыя вядомыя акцёры бянтэжацца, калі ім даводзіцца раздзявацца перад здымачнай групай. Таму лепш зняць інтымную сцэну у адзенні, а потым «сцерці» яго на камп'ютары...

Няўжо, набываючы квіток на прэм'еру кінастужкі (ці купляючы дыск), напрыклад, з Анджалінай Джалі, Джэніфер Лопес (давайце прыгадаем яе страхаванне «пятай кропкі» на мільён долараў) ці Эністан у галоўнай ролі, мы (калі таго вымагае жанр фільма) не разлічваем пабачыць тое, за што «галасуем» уласным рублём? Усё па справядлівасці, так? Вядома, калі з'яўленне аголенай натуры адпавядае месцу і часу. Можна колькі заўгодна «перамываць костачкі» Міхалкову, які прымусіў сваю дачку ў «Стомленых сонцам-2» паказаць грудзі паміраючаму танкісту. Скажыце, а што цнатлівы малады чалавек мог папрасіць паказаць у дзяўчыны, якая выпадкова аказалася побач у апошні момант яго жыцця?.. Ведаеце, як у інтэрнэце (яшчэ да выхаду фільма) абмяркоўвалася сцэна ў лазні з рэмейку «А світанні тут ціхія...»? Ёсць ці не на Крысціне Асмус, якая іграе адну з гераінь, ніжняя бялізна цялеснага колеру...

Не, вядома, і раней існавалі розныя хітрыкі. Неяк Людміла Гурчанка на адным са спектакляў шакіравала гледачоў у зале, а потым і ўвесь бамонд, калі ў нейкі момант ліха расхінула блузку і прадэманстравала «босыя грудзі» дзявоцкай свежасці. Праўда, інтрыга пратрымалася нядоўга: Людміла Маркаўна ўсяго толькі скарысталася спецыяльнай накладкай... Але такому таленту гэты нявінны жарт можна і дараваць. А калі цяпер «маляваць» памеры Памелы Андэрсан пачне кожная «зорка» якога-небудзь серыяла, чыё імя насамрэч вядомае толькі ў вузкіх колах сяброў?!.

Але! Дапамога прыйшла, адкуль і не чакалі! «Ворагу не здаецца наш горды «Вараг»! Менавіта тая самая Шэран Стоун больш чым праз 20 гадоў пасля выхаду фільма ўзяла і знялася для аднаго часопіса цалкам аголенай! Яна прызнаецца, што не абышлося без фоташопу, аднак нават калі зрабіць папраўку на гэта, усё адно даводзіцца канстатаваць відавочнае: Шэран — супер. Такім і павінен быць «асноўны інстынкт» сапраўднай актрысы і прыгожай жанчыны.

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«Заплакаў, даведаўшыся пра перамогу»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— З якім настроем збіраешся зноў вярнуцца ў Балгарыю?

— Тады я перамог на конкурсе. Цяпер жа буду змагацца за званне самага лепшага ўжо на больш сур'ёзным узроўні. Трэба зрабіць усё, каб на наступны год «Еўрабачанне» прыехала ў Беларусь. Праўда, пра зборы пакуль не думаем. Вырашаем арганізацыйныя пытанні. Цяпер цалкам пераключыўся на вучэбны працэс.

Вучыцца Руслан шмат, ён амаль што выдатнік у гімназіі, паралельна займаецца ў музычнай школе па класе саксафона і паспявае пры гэтым дэманстраваць свае здольнасці на розных вакальных спаборніцтвах. І часта пра нешта марыць (можа, уяўляе запаветны дзень, калі атрымае Grammy ці збярэ стадыён на сваім канцэрце?), што заўважаюць нават настаўнікі.

— Складана пераключацца, сумяшчаць вучобу ў школе і артыстычныя будні?

— Тут шмат што залежыць ад паразумення з настаўнікамі. Сёлета да мяне ставіліся лаяльна. Але я заўсёды імкнуся да добрых вынікаў, як у вучобе, так і ў музыцы. І сёння ўпершыню адчуў, што мне хочацца ісці ў школу. У мінулым годзе давялося шмат прапусціць, бо мы практычна жылі ў Кіеве, калі ішоў «Голас». А наперадзе — падрыхтоўка да «Еўрабачання». Чакаю ад сябе і на конкурсе, і ў вучобе добрых поспехаў.

— Жыць у рытме раз'ездаў, канцэртаў, рэпетыцый табе падабаецца?

— Я не магу проста сядзець на адным месцы і нічога не рабіць альбо займацца руціннай працай. Калі ёсць нейкі праект, то дома мяне ўжо не ўбачыш. Напрыклад, конкурс «Новая хваля» дае мне магчымасць знаёміцца з вядомымі музыкантамі. Летам я выступаў з гуртом «Піца». І мы з сям'ёй больш за тыдзень былі ў Ялце. Нават па бацьках не сумую, бо мама ці тата заўсёды побач са мной. Мне падабаецца бываць у розных краінах і заводзіць кантакты з новымі людзьмі. Ніякі артыст ад такога не адмовіцца.

Фота БЕЛТА.

...Мяне здзівіла, калі мама расказала, што Руслан на сцэне рухавы і артыстычны, у звычайным жыцці — вельмі сціплы і спакойны. Аднак хлопец заўважыў: «Апошнім часам хочацца пахуліганіць». І гэта пры тым, што рэдка калі можна было заўважыць яго ў бойках з аднагодкамі, хоць заўсёды заступаўся за дзяўчат, не разумеючы, як іх можна ўвогуле крыўдзіць. Яму 13 гадоў — якраз той узрост, калі так хочацца быць не падобным да іншых. Змяняюцца музычныя густы, з'яўляюцца новыя героі. Зараз ён любіць слухаць групу Rammstein і джаз, пры магчымасці гуляе з сябрамі ў футбол і «хварэе» за каманду «Баварыя». Але знаходзіць таксама час, каб дапамагчы бацькам па хатніх справах.

— Магу памыць машыну, у хаце папылясосіць. А бывае, што маці дапамагаю гатаваць нешта смачнае. Амлет, яечню, нават торт магу спячы.

— Калі ездзілі на «Голас», то ў эфіры аднаго ўкраінскага тэлеканала ён гатаваў бульбяную бабку, чым вельмі развесяліў усю здымачную групу. Мы нават на цягнік ледзь не спазніліся, — успамінае адну з «кулінарных» прыгод сына маці Ганна Валянцінаўна.

— Руслан, скажы, а ў чым бацька з'яўляецца для цябе прыкладам?

— Бацька для мяне — узор таго, якім павінен быць сапраўдны мужчына. Ён можа быць строгім, але насамрэч вельмі добры і з выдатным пачуццём гумару. А яшчэ мудры. Мяне ён выхоўвае на прыкладах са свайго жыцця. Так, ад яго я ведаю, што ў нейкай спрэчцы лепш тлумачыць сваю пазіцыю словамі, а не кулакамі. У чым часта дапамагае ўсходняя мудрасць.

— А сяброў у цябе шмат?

— Не вельмі, але ёсць сапраўдныя. Ведаеце, часам здаецца, быццам сябруеш з кімсьці, і ў вас усё добра. Потым здараецца нешта дрэннае, і ты разумееш, што твой сябар не ратуе цябе, а «дабівае». Аднак і я не ідэальны. Ёсць у мяне сябар, з якім мы знаёмыя даўно. Ён жыве ў Буда-Кашалёве і крыўдзіцца, калі паміж намі страчваецца сувязь. Але гэта той чалавек, які з самага пачатку бачыў мой рост у музыцы. І калі мне аднойчы спатрэбіцца яго дапамога, то я магу нават яму не гаварыць, ён ужо ўсё зробіць...

Слухаючы такія разважанні зусім юнага артыста, становіцца зразумела, што Руслан зможа дасягнуць многага. Ён шмат працуе. А побач заўсёды ёсць людзі, якія падтрымліваюць, вераць і кантралююць, каб галава ад поспеху не закружылася...

Алена ДРАПКО.
drapko@zviazda.by

Твар матывацыі

У КОЖНЫ ОФІС — ПА ПРЫГОЖАЙ ДЗЯЎЧЫНЕ

Новы незвычайны спосаб матывацыі праграмістаў і павышэння прадукцыйнасці іх працы ўкаранілі ў Кітаі.

Як паведамляе china.org.cn, інтэрнэт-кампаніі наймаюць прыгожых дзяўчат, каб падымаць настрой работнікам, занятым у распрацоўцы праграмных прадуктаў. Фактычна дзяўчаты выконваюць ролю офісных чырлідараў. Яны ствараюць вясёлую рабочую атмасферу, купляюць праграмістам сняданкі і гуляюць з імі ў пінг-понг.

Менеджары па персанале тлумачаць: праграмісты — пераважна мужчыны, якія дрэнна сацыялізуюцца. А прысутнасць прыгожых дзяўчат істотна павышае матывацыю і настройвае на эфектыўную працу.

Аднак карыстальнікі сацыяльных сетак разышліся ў думках наконт «рэвалюцыйнай ідэі». Многія знайшлі яе абразлівай. «Найміце лепш жанчын-праграмістак», — напісаў адзін карыстальнік у Facebook. Жаночая аўдыторыя палічыла, што дзяўчаты, верагодна, зрабілі б тую ж працу нашмат лепш, прычым без прыцягнення якой-небудзь матывуючай падтрымкі. «А як наконт жанчын-праграмістак? Ці могуць яны разлічваць на сімпатычных мужчын побач?» — задалася пытаннем яшчэ адна карыстальніца сацыяльных сетак.

Дарэчы, нядаўна СМІ звярнулі ўвагу яшчэ на адну незвычайную акцыю, якую зладзіла кіраўніцтва кітайскай кампаніі WOffice ў горадзе Ханьдань. Супрацоўнікам фірмы дазволілі «адпачыць ад няшчырых усмешак» і адзін дзень хадзіць па офісе ў масках, каб «зняць стрэс» .

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.022.
Нумар падпісаны ў 19.30 09.09.2015 г.

САМЫ БУЙНЫ ПРАВАСЛАЎНЫ ХРАМ У КРАІНЕ

Сёлета ў жніўні ў Магілёве адбылося асвячэнне Спаса-Праабражэнскага храма. Яго здзейсніў Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел.

Пабудаваны ў Магілёве Спаса-Праабражэнскі сабор — самы буйны ў Беларусі праваслаўны храм. У ім адначасова змогуць прыняць удзел у набажэнстве 3,5 тысячы вернікаў. Будынак увянчаны купаламі і крыжамі, дзякуючы якім ён дасягае 60 метраў у вышыню.

Будаўніцтва храма пачалося ў 2000 годзе. Культавы будынак узводзіўся на сродкі ахвяраванняў прыхаджан, за кошт дабрачыннай дапамогі прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў вобласці, а таксама спонсарскай дапамогі ад праваслаўных прыходаў з-за мяжы.

ЖАМЧУЖЫНА НА БЕРАЗЕ ДНЯПРА

Новая гасцініца на 114 месцаў з'явілася летась у Жлобіне. 9-павярховы будынак з прыгожай назвай «Дняпроўская жамчужына» пабудаваны ўсяго за сем месяцаў.

Гэта амаль у два з паловай разы хутчэй за нарматыўны тэрмін. Улічваючы тое, што аб'ект мае маналітны каркас, тэрміны яго ўзвядзення ўражваюць. Генпадрадчыкі адзначаюць, што сакрэт, які дазваляе весці будаўніцтва паскоранымі тэмпамі, заключаецца ў выкарыстанні інавацыйных тэхналогій. Яшчэ адна асаблівасць: пры будаўніцтве і аздабленні выкарыстоўваліся толькі айчынныя матэрыялы. Інжынерныя сістэмы, абсталяванне, мэбля, пасцельная бялізна ў новай гасцініцы таксама беларускай вытворчасці.

У новым гасцінічным комплексе 68 нумароў, з іх восем — люкс, восем — паўлюкс, трыццаць двухмесных і дваццаць два аднаместныя. Акрамя таго, да паслуг пастаяльцаў — камфортная зала перамоў, канферэнц-зала на 48 месцаў, кавярня на 48 месцаў, бар, боўлінг на чатыры дарожкі, більярдныя сталы, аэрахакей, цырульня, крама сувеніраў і пункт абмену валюты.

БАЛЬНІЦА XXI СТАГОДДЗЯ Ў ШАРКАЎШЧЫНЕ

Самая прыгожая і сучасная цэнтральная раённая бальніца была пабудавана ў Віцебскай вобласці ў лістападзе 2012 года.

Бальніца была адным з даўгабудаў, яе ўзводзілі з сярэдзіны 90-х. Аднавіліся работы ў 2009 годзе, на што толькі з абласнога бюджэту адшукана каля 40 мільярдаў рублёў. Гэта ў чарговы раз даказвае, што для ўлады галіна аховы здароўя людзей з'яўляецца прыярытэтам не на словах, а на справе. Будавалася бальніца талакой, і ў гэтым няма перабольшання. Генеральным падрадчыкам быў «Полацксельбуд», а задзейнічана трынаццаць субпадрадных арганізацый — з самой Шаркаўшчыны, Глыбокага, Наваполацка, Полацка, Докшыц, Віцебска і Мінска. Гэта была будоўля рэгіёна, таму што літаральна ўсе арганізацыі прымалі ўдзел у завяршальных работ і добраўпарадкаванні.

Цяпер ва ўнікальным будынку з самым сучасным абсталяваннем лечацца жыхары не толькі Шаркаўшчынскага, але і суседніх раёнаў.

АЎТАВАКЗАЛ У МАЛАДЗЕЧНЕ

Непасрэдна да пачатку 2010 года гэты раённы цэнтр атрымаў сапраўды функцыянальны і прыгожы вакзал. Новы будынак стаў сапраўдным упрыгажэннем горада і адным з самых «прасунутых» аўтавакзалаў у краіне. Ён аснашчаны самым сучасным абсталяваннем, устаноўлены камп'ютарныя тэхналогіі і аўтаматызаваная сістэма па продажы квіткоў. Цяпер у пасажыраў ёсць магчымасць купіць білеты з адпраўленнем з іншых аўтавакзалаў краіны. А электроннае табло, наогул, лічыцца самым вялікім у Беларусі.

Маладзечанскі аўтавакзал не адзіны падобны аб'ект, які прайшоў маштабную рэканструкцыю. Такія работы толькі ў Мінскай вобласці вяліся ў Чэрвені, Уздзе і Мар'інай Горцы. І ў іншых рэгіёнах Беларусі аўтавакзалы не засталіся па-за ўвагай. Існуе дзяржпраграма, накіраваная на абнаўленне рухомага саставу, будаўніцтва і рэканструкцыю будынкаў вакзалаў, укараненне такіх сучасных тэхналогій, як аўтаматызаваная сістэма аб'яў і продажу квіткоў.

ПАЛАЦ ВОДНЫХ ВІДАЎ СПОРТУ Ў БРЭСЦЕ

У кастрычніку 2010 года з удзелам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Брэсце быў урачыста адкрыты Палац водных відаў спорту, аналагаў якому сёння ў краіне няма. Палац прызначаны для правядзення спаборніцтваў рознага рангу, уключаючы міжнародныя, для прафесійных заняткаў спортам, актыўнага і карыснага для здароўя адпачынку.

Будынак Палаца водных відаў спорту пабудаваны па індывідуальным праекце складанай канфігурацыі з агульнай плошчай звыш 26 тысяч квадратных метраў. Ён уключае ў сябе 4 басейны, 6 спартыўных залаў, абсталяваных у адпаведнасці з сусветнымі стандартамі для правядзення спаборніцтваў міжнароднага ўзроўню.

Сёння тут ёсць вучэбна-трэніровачны басейн з сучаснай сістэмай электроннага хронаметражу «Амега» і «Splash Meet Manager», якая дазваляе праводзіць міжнародныя спаборніцтвы на высокім тэхнічным узроўні і публікаваць вынікі ў рэжыме анлайн. У палацы дзейнічае спецыялізаваная спартыўная зала для скачкоў у ваду і сінхроннага плавання.

На думку дэпутата

Уладзімір ПУЗЫРЭЎСКІ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве:

— З моманту атрымання незалежнасці Беларуссю пабудавана каля мільёна кватэр з дзяржаўнай ды іншай падтрымкай. Лічба сапраўды ўражвае. Калі падлічыць, што ў кватэры ў сярэднім можа жыць чатыры чалавекі, то атрымліваецца, што можна рассяліць амаль палову краіны. Зразумела, што такіх поспехаў немагчыма дасягнуць у момант. Гэта вынік сацыяльна арыентаванай палітыкі, якую праводзіць дзяржава. Яна непасрэдна звязана з імем і воляй кіраўніка краіны.

Калі мы кажам слова «будаўніцтва», то маем на ўвазе не толькі будынкі. Па вялікім рахунку, дзякуючы дзяржаўным праграмам аднавілася айчынная прамысловасць, сельская гаспадарка. Ці ўсе мы ведаем, што сёння ў нашай краіне робіцца столькі прадукцыі, што яе можа хапіць на 30 мільёнаў чалавек? Хаця жыхароў у рэспубліцы ў 3 разы менш. І вымушаны прадаваць яе лішкі. А гэта дзякуючы таму, што ў свой час на дзяржаўным узроўні актыўна падтрымлівалася будаўніцтва аграгарадкоў, новых сучасных сельгаскомплексаў.

Калі казаць пра будаўніцтва культурных, спартыўных аб'ектаў, то навошта далёка хадзіць? Як змяніўся адзін толькі Мінск за апошнія гады! Я лічу, што ўсе гэтыя дасягненні даюць магчымасць ганарыцца сваёй Айчынай і дзяржавай.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА, Яўгена ПЯСЕЦКАГА, БЕЛТА.

ГРОДЗЕНСКАЯ ГЭС

На рацэ Нёман у нашай краіне ўпершыню была пабудавана гідраэлектрастанцыя сярэдняй магутнасці. Увогуле, аб'ект будаваўся на працягу 52 месяцаў, пасля чаго ў жніўні 2012 года ён пачаў выдаваць рэгіёну электрычнасць.

Сёння спецыялісты адзначаюць, што працуе яна яшчэ больш эфектыўна, чым меркавалася. Гідраэлектрастанцыя ўяўляе з сябе складаны механізм: ад створанага вадасховішча агульным аб'ёмам у 2 млн «кубоў» вады раку адгароджвае жалезабетонная плаціна з электратэхнічным абсталяваннем. Вада імкнецца на ніжэйшы ўзровень, што і прымушае круціцца турбіны, якія выпрацоўваюць электрычную энергію. Потым пяць генератараў магутнасцю 3,4 МВт кожны выдаюць ад станцыі агульную магутнасць у 17 МВт.

Пры ўзвядзенні гідраэлектрастанцыі было створана вадасховішча агульнай плошчай да 2 тысяч гектараў. Пры арганізацыі штучнага вадаёма не ажыццяўляліся адсяленне жыхароў, знос гаспадарчых пабудоў і затапленне сельскагаспадарчых земляў, як гэта звычайна бывае. Увогуле, створанае вадасховішча не выходзіць за памеры былой поймы ракі падчас веснавой паводкі, што сведчыць аб сучаснай экалагічнасці праекта. Больш за тое, ён прадугледжвае добраўпарадкаванне 300 гектараў земляў, тэрыторыя якіх раней наогул не выкарыстоўвалася. Узніклі новыя дарогі, пабудаваны мост і створана зона перспектыўнай гадоўлі рыбы плошчай 105 га. Сабекошт гэтага вадаёма дасягнуў 30 млн долараў. Падобныя інвестыцыі заўсёды даюць прыбытак дзяржаве. Вакол самаробнага возера з'явілася шмат унікальных месцаў для адпачынку і нават развіцця бізнесу.

Спецыялісты адзначаюць, што ўжо цяпер вакол вадасховішча ў некалькі разоў павялічыўся кошт зямельных участкаў. На іх актыўна будуюцца сучасныя жылыя дамы і катэджы. Узнікненне новай экасістэмы павінна даць пэўны штуршок для далейшага развіцця ў рэгіёне аграэкатурызму.

Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» оказывает услуги по:

- оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование)
- организации и проведению аукционных торгов
- инвентаризации и оценке зеленых насаждений

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ
12 октября 2015 г. в 11.30
состоятся открытые аукционные торги по продаже имущества, обращенного в доход государства, одним Лотом (предмет торгов):

Наименование и адрес предмета торгов (Лота):	- капитальное строение 710/С-9114 (здание магазина смешанной торговли и офиса) общ. пл. по данным выписки из ЕГРНИ – 847,6 кв.м, по данным ведомости технических характеристик общ. пл. – 867,4 кв.м; - роллеты размером 1000х1870 мм в кол-ве 6 штук; - роллеты размером 2340х2800 мм в кол-ве 2 штук, расположенные по адресу: г. Бобруйск, ул. К.Маркса, д. 36
Организатор торгов	Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509 (220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска МФО 153001369)
Место проведения торгов и подачи документов	г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления филиала «Центр «Белтехинвентаризация»
Начальная цена продажи лота	**20 899 957 800** рублей, размер задатка – 10%, что составляет – **2 089 995 780** рублей
Номер расчетного счета для перечисления задатка	Получатель платежа – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, код 153001369
Информация о земельном участке	Земельный участок с кадастровым номером 741000000006000115, расположен по адресу: г. Бобруйск, ул. Карла Маркса, 36, площадь условного участка – 333 кв.м
Характеристика текущего состояния предмета торгов	Здание магазина 4-этажное кирпичное, год постр. – 1918, год реконструкции – 2005, фундамент – бутовый, перекрытия: чердачные – дерев., междуэтажные и подвальные – ж/бетон., кровля – металлочерепица, полы – плитка и бетон., отопление – от собств. котельной, имеются: водопровод, электроснабжение, центральная канализация, роллеты разных размеров. Состояние объекта – хорошее.
Условия продажи	Без условий
Срок и условия оплаты за приобретенное с торгов имущество	В течение 80 календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на счет Организатора торгов разовым платежом либо траншами
Срок подачи документов, осмотра предмета торгов и внесения задатка	**по 06 октября 2015 г. включительно до 16.00**

Для участия в торгах в адрес Организатора торгов необходимо предоставить: заявление на участие в торгах; документ с отметкой банка, подтверждающий о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет; паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;
резидентам Республики Беларусь: индивидуальным предпринимателям – свидетельство о государственной регистрации; **юридическим лицам** – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации (копию документа о создании организации, если она не подлежит государственной регистрации);
представителю физического лица и индивидуального предпринимателя – нотариально заверенную доверенность;
